

ПРА ПАМЫЛКІ БАЦЬКОЎ ПЕРШАКЛАСНІКАЎ

Сямейная газета

АКУНУЦЦА Ў КРЫНІЦУ І МЁДУ ПАКАШТАВАЦЬ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЖНІЎНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 153 (29020)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Турызм — важная сфера эканомікі, патэнцыял якой далёка не цалкам рэалізаваны. У 2018 годзе экспарт турыстычных паслуг склаў каля $230 млн, але я ўпэўнены, што гэты паказчык можа быць значна вышэйшы. Для развіцця турсферы ў краіне прымаюцца канкрэтныя крокі. На мінулым тыдні быў падпісаны ўказ аб аб'яднанні Гродзенскай і Брэсцкай бязвізавых тэрыторый. Акрамя таго, бязвізавая зона пашырана. Фактычна ніякіх бар'ераў для наведвання рэгіёнаў няма. Гэта яшчэ больш прастымулюе экспарт турыстычных паслуг. Цяпер задача за туркампаніямі, прыватным бізнесам, занятым у гэтай сферы. У Беларусі ёсць што прапанаваць і паказаць замежнікам і ў гістарычным, і ў аздараўленчым, і ў іншых відах турызму. Аднак важна не проста прывабіць турыста, а стварыць яму камфортныя ўмовы ў плане пражывання, грамадскага харчавання. Тут ёсць над чым папрацаваць, асабліва ў невялікіх населеных пунктах».*

# ДЫСЦЫПЛІНА ДАРАЖЭЙ ЧЫМ ЗОЛАТА

## Прэзідэнт наведаў з рабочай паездкай Касцюковіцкі раён



Фота БелТА.

**Свой візіт у паўночна-ўсходнія рэгіёны Магілёўскай вобласці Аляксандр Лукашэнка анансаваў 29 ліпеня падчас узгаднення прызначэння кіраўнікоў мясцовых органаў улады. Доўга чакаць лідара краіны не прыйшлося — крыху больш чым праз два тыдні яго верталёт прызямліўся на ўсходзе краіны.**

Касцюковічы — на самым усходзе Беларусі, на мяжы з расійскай Браншчынай. Рэгіён, які багаты карысными выкапнямі (цэментнай, цэглавай сыравінай, гравіем, торфам), пасля чарнобыльскай катастрофы страціў вельмі шмат. 40 працэнтаў зямель, 78 населеных пунктаў, дзе пражывала 11 тысяч чалавек, былі забруджаны радыеактыўнымі рэчывамі.

Падчас ліпеньскай сустрэчы Прэзідэнт падкрэсліў: яго цікавіць, як рэалізуецца ўказ па сацыяльна-эканамічным развіцці паўночна-ўсходняга рэгіёна Магілёўшчыны і адпаведная рэгіянальная праграма, разлічаная да 2020 года. Размова пра Крычаўскі, Клімавіцкі, Краснапольскі, Касцюковіцкі, Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі і Хоцімскі раёны. Згодна з Указам № 235 ад 8 чэрвеня 2015 года, шэраг прэферэнцый, ільгот для прадпрымальнікаў і жыхароў гэтых мясцовасцяў павінны паспрыяць развіццю эканомікі і дабрабыту насельніцтва.

Выкананне ўказа і праграмы развіцця стала галоўнай тэмай нарады, якая праходзіла ўчора ў Касцюковічах.

### САКРЭТЫ МАГІЛЁЎСКІХ РЫБАВОДАЎ

Першы пункт візіту Аляксандра Лукашэнкі — Адкрытае акцыянернае таварыства «Фарэлевая гаспадарка «Лахва». Прадпрыемства складаецца з некалькіх комплексаў. У Касцюковіцкім раёне размешчаны вытворчы ўчастак «Фарэлевая гаспадарка «Высокае», заснаваны ў сакавіку 2015 года. У год у Касцюковічах можна вырошчваць да 300 тон радужнай стронгі.

За апошні час на комплексе распрацавана адметная стратэгія рыбаводства. Калі раней прадпрыемства рэалізоўвала ў асноўным жывую рыбу, то цяпер прадае 80 % перапрацаванай прадукцыі. Прэзідэнт даў даручэнне да канца года актуалізаваць праграму па развіцці рыбаводства і сфармуляваць канкрэтныя прапановы па падваенні вытворчасці. Займацца рыбаводствам, на думку лідара краіны, трэба не толькі на Магілёўшчыне.

СТАР. 2

## Выбары-2019

### Ажыўленне кампаніі чакаецца з пачаткам восені

**Пра гэта паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

«Першы этап, які мы зараз праходзім, — падача дакументаў у склады акруговых выбарчых камісій з боку палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. Некаторыя з іх ужо правялі свае пасяджэнні, прыносяць дакументы ў абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты і адпаведныя мясцовыя Саветы дэпутатаў. Апошні тэрмін падачы дакументаў — 30 жніўня. Камісіі будуць утвораны да 2 верасня ўключна, — нагадала яна каляндарны план бягучай выбарчай кампаніі ў ніжнюю палату беларускага парламента. — Вось з 2 верасня ўжо і пачнецца нейкае ажыўленне, бо з гэтага моманту патэнцыйныя кандыдаты ўжо могуць падаваць дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па іх вылучэнні».

СТАР. 2




## КОРАТКА

- **Заяўкі на летні ЧС па біятлоне ў «Раўбічах» падалі 27 нацыянальных федэрацый.**
- Беларускія мытнікі афармляюць партыю экспартных тавараў пры адданым выпуску не больш за пяць хвілін.
- **У Белавежскай пушчы пройдзе Дзень жывой археалогіі.**
- У Японіі за тыдзень ад спёкі памерлі 23 чалавекі.

ISSN 1990 - 763X

## Расклад на заўтра

# ШТО Ў МЕНЮ ШКОЛЬНІКА

### Рол «Маленькі Цэзар» і катлета «Выдатнік» сталі любімымі стравамі юных мінчан

**Абед у школьнай сталоўцы ў новым навучальным годзе абыдзецца бацькам не больш чым у 2,5 рубля. Якім будзе меню вучняў і якія стравы больш за ўсё любяць беларускія школьнікі, а таксама чаго не хапае ў рацыёне дзяцей і дарослых беларусаў, расказалі дыетолагі, прадстаўнікі камбіната школьнага харчавання і іншыя спецыялісты.**

### Папулярныя стравы застануцца

Рол «Маленькі Цэзар» (або шаўрма, як празвалі яго самі школьнікі) — адна з самых любімых страў беларускіх вучняў. Назвалі яе па аналогіі з вядомым салатам «Цэзар», бо складаецца страва з амаль тых жа інгрэдыентаў. Мяса курыцы, апрацаванае ашчаджальным спосабам, капуста, памідор і соус са смятаны. Усё гэта загортваецца ў тонкі лаваш — і самае папулярнае блюда мінскіх школьнікаў гатова.

— Нам нават тэлефанавалі бацькі і скардзіліся, што мы кормім дзяцей шаўрмой. Але ж гэта іншая страва. Тут усе прадукты дазволеныя для харчавання дзяцей, — дзеліцца **намеснік начальніка аддзела арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Марына ДЗЯКАВА.** — У дзяцей жа гэта любімая страва.

Таксама сярод упадабаных школьнікамі — запяканка з сыру-рыкоты, катлеты «Выдатнік» (з курацiны і свініны) і «Карпыч» (з карпа).

— Рыбу, у тым ліку і карпа, дзеці не вельмі любяць. Але мы вырашылі паэксперыментаваць: зрабілі катлету «Карпыч». Дзеці папрасілі дадаваць менш часнаку — і катлета пайшла на ўра, — расказвае спецыяліст. — Традыцыйная запяканка з тварагу з разынкамі не вельмі падабалася школьнікам. Мы зрабілі яе з беларускай рыкоты — і ўсе з задавальненнем ядуць. Нават кандытарскія вырабы, якія прадаюцца ў школьных буфетах, мы імкнёмся рабіць больш карыснымі — у якасці начынкі для булачак і піражкоў выкарыстоўваем фрукты.

Марына Дзякава падкрэсліла, што сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук былі распрацаваны біялагічна актыўныя дабаўкі, якія ўтрымліваюць вітаміны A, E, D, кальцый і магній, — яны будуць дадавацца ў ежу. Таксама дзецям ільготных катэгорый прапануюць батончык «Гематагеша».

СТАР. 4

# ДЫСЦЫПЛІНА ДАРАЖЭЙ ЧЫМ ЗОЛАТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Чаго мы баімся? Дробязі гэтай, малька, яны створаць колькі хочаш. Але трэба пабудаваць памяшканне, участкі для вырошчвання гатовай рыбы. Гэта невялікія грошы. Што такое тры мільёны? Калі па-сапраўднаму ўзяцца за гэта, дык і менш, чым тры, — сказаў Прэзідэнт. — Самае прыцягальнае, што тэхналогіі выдатныя, можам выпускаць прадукцыю, рынкі для збыту ёсць».

## САМАЯ «ГАРАЧАЯ» ТЭМА ЛЕТА

Губернатар Магілёўскай вобласці Леанід Заяц падчас наведвання фарэлевай гаспадаркі далажыў аб сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна, ходзе ўборачнай кампаніі, нарыхтоўцы кармоў.

«Для збожжа патрэбны вельмі жорсткі кантроль. Асабліва ў Магілёўскай вобласці. Правільна заўважана, тэхналагічнай дысцыпліны тут няма, усё па-даўнейшаму, не ва ўсіх, канешне, гаспадарках. Але ў добрай палавіне думаюць, маўляў, упіхнём гэта зерне ў рукаў без кансерванту і будзе добра. Гэта не так. У лепшым выпадку будзе, як у народзе кажуць — кісляцё, а ў горшым выпадку — усё згніе. Таму трэба ўзяць пад кантроль і той недабор, які, магчыма, будзе па каласавых збожжавых, кампенсаваць кукурузным зернем», — загадаў кіраўнік краіны.

Сушыць кукурузнае зерне дорага, таму такім метадам захоўваць трэба частку, а астатняе нарыхтоўваць танней з дапамогай поліэтыленавых рукавоў.

«Вось учора мне Шарснёў дакладваў, што нават у Віцебскай вобласці яны ўжо за год паспрабавалі і зразумелі, што гэта добры тэхналагічны прыём для таго, каб як мага танней захаваць кукурузнае зерне», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

## ДРУГОЕ ДЫХАННЕ ДЛЯ РЭГІЁНАЎ

Пасля наведвання гаспадаркі, на нарадзе Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра сваё абяцанне на месцы разгледзець сітуацыю па рэалізацыі Указа № 235 і праграмы развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці. «Яны (раёны. — «Зв.») больш за ўсё на Магілёўшчыне пацярпелі ў свой час у сувязі з катастрофай на Чарнобыльскай атамнай станцыі. І ў мэтах актывізацыі сацыяльна-эканамічнага развіцця гэтага рэгіёна чатыры гады таму было прынятае рашэнне аб стымуляванні развіцця гэтых раёнаў», — звярнуў увагу лідар дзяржавы.

Нарада мела кантрольны характар: абмяркоўвалася эфектыўнасць згаданых рашэнняў і ацэньваліся прамежкавыя вынікі.

«Жыццё на месцы не стаяла. Адбыліся пэўныя зрухі да лепшага, створаны новыя прадпрыемствы, з'явіліся новыя людзі. Але як мне дакладваюць, праблем хапае. Рэалізаваны асобныя праекты ў дрэваапрацоўцы, мадэрнізаваны цэментныя прадпрыемствы, створаны дадатковыя рабочыя месцы ў прадпрыемальніцкім асяродку, уведзена ў эксплуатацыю больш за 125 тысяч квадратных метраў жылля», — пералічыў Прэзідэнт, заўважыўшы, што пры гэтым запланаваныя праграмай мерапрыемствы ажыццяўляюцца маруднымі тэмпамі.

Асобныя пункты дакумента выключаюцца, сродкі, якія выдзеляныя, не асвойваюцца. Жаданага ўсплёску дзелавой актыўнасці не адбылося, ды і колькасць занятых у эканоміцы скарацілася.

«Усё б нічога, калі б стварылі высокатэхналагічную вытворчасць, дзе замест сотні чалавек працуюць дзесяць. Ці як мы зараз былі на высокатэхналагічным рыбакомплексе, там працуюць усяго, па-мойму, шэсць чалавек. Страху няма ў тым, што скарацілася занятасць і няма беспрацоўя — гэта добра. Але паўстае пытанне прыцягнення сюды дадатковага насельніцтва і разам з тым стварэння для іх месца пражывання і работы», — заявіў беларускі лідар.

Галоўнае патрабаванне Аляксандра Лукашэнкі ад кіраўнікоў дзяржаўнага і мясцовага ўзроўню — людзі павінны быць упэўнены ў заўтрашнім дні, мець работу, годны заробак і камфортныя ўмовы для пражывання.

## ЗАНЯЦЦА «ЗЯМНЫМІ» ПРАБЛЕМАМІ

Прэзідэнт звярнуў увагу на пытанне забеспячэння спецыялістаў жыллём. Узводзіць кватэры трэба пад адпаведныя прадпрыемствы і іх супрацоўнікаў: будуецца завод — будуецца жыллё.

«Давайце будаваць дамы для канкрэтных людзей, тады будзе карысць. І тады магчыма пракантраляваць і спытаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўніцтву вобласці Прэзідэнт даў даручэнне дэталёва разгледзець і актуалізаваць праграму развіцця рэгіёна. Пачаць работу неабходна адразу пасля нарады.

Патрабуе лідар краіны і дысцыпліны пры ўборцы ўраджаю і падрыхтоўцы да сяўбы азімых. «Азімыя 75 працэнтаў будзеце сеяць. Правільна, трэба пасеяць. І дзень, і ноч будзем сеяць, гэта абсалютна правільна. І гэта павінна быць ва ўсёй краіне», — пагадзіўся Аляксандр Лукашэнка.

Землі Магілёўскай вобласці Прэзідэнт назваў запушчанымі і заклікаў займацца «зямнымі» пытаннямі: «І калі вы бачыце, што там ёсць кармы, можна ставіць комплекс, можна свінаводчы, калі запыт на свініну вы бачыце». Удзяліць у гэтым ключы трэба ўвагу і кантролю за афрыканскай чумой свіней, якая захапіла суседнія вобласці Расіі. Ёсць запыт і на ялавічыну — з боку кітайскага рынку.

«Рынак ёсць, умеем гэта рабіць. Паглядзелі, у Касцюковічах трэба паставіць комплекс па вытворчасці малака. Мы ўмеем іх будаваць. Там ёсць землі, там ёсць людзі, можна яшчэ пяць-шэсць дамоў пабудаваць для таго, каб спецыялісты былі на гэтым комплексе. Туды іх прывезці, пасяліць», — прыводзіць прыклад кіраўнік Беларусі.

Пункт росту для любога рэгіёна — запыт рынку. Перспектыўныя нішы можна знайсці заўсёды — гэта і рыбаводства, і перапрацоўка драўніны і іншыя.

## ІНІЦЫЯТЫВА — АД МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

Ёсць пытанні і па мясцовых кадравых рэсурсах. На думку Прэзідэнта, выканкамы нават «патроны не падносяць». Старшыні райвыканкамаў павінны дапамагаць кіраўніцтву вышэйшага ўзроўню, даваць парады, прапаноўваць ідэі.

Звярнуўся Прэзідэнт да прадстаўнікоў улады з патрабаваннем адказнага стаўлення да сельскагаспадарчай тэхнікі: «Мы на 30 працэнтаў, нават больш, можам вырашыць праблему толькі за кошт дысцыпліны. Не трэба ніякіх грошай, трэба проста дысцыпліна».

Падводзячы вынікі нарады, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: чатыры гады таму мучыўся пытаннем, ці існуе праблема гэтых рэгіёнаў, і не быў упэўнены ў неабходнасці вырашэння задач паўднёва-ўсходніх раёнаў Магілёўскай вобласці ў той час.

«Я выходзіў з жыцця: усё роўна нам калісьці прыйдзецца гэтым пытаннем займацца. І тады даручыў не дзяржаўную праграму распрацаваць, — канстатаваў беларускі лідар. — А сказаў, хай вобласць распрацоўвае гэту праграму і рэалізоўвае. А ўказ, які я падпісаў, гэта каб падперці вас, каб вы рухаліся, вырашаючы тыя праблемы, якія вы тут на месцы бачыце».

Задачы праграмы сёння — атрымаць аддачу ад гэтых раёнаў, каб грамадзяне жылі годна і ганарыліся сваёй малой радзімай.

Прэзідэнт адзначыў: улады ведаюць, што трэба рабіць для рэгіёна, і яны гэта зробяць. «Хто не ўмее — навучым, хто не хоча — заставім. Іншага не дадзена. Але гэты рэгіён кожны год павінен дэманстраваць дынаміку росту. Паказальнікі простыя, як у сельскай гаспадарцы, прамысловасці і іншых. Хочаце малы, сярэдні бізнес, індывідуальных прадпрымальнікаў, калі ласка, займайцеся, але запомніце — правільна тут сказаў старшыня камітэта, колькі парадзілі, столькі і знішчылі гэтых сярэдніх, малых і іншых. Патрэбны моцныя прадпрыемствы, якія могуць працаваць доўга, трывала і гэта — упэўненасць людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прадпрыемствы, якія зарабляюць грошы, створаць падмурак і для вырашэння праблем сацыяльнай сферы ў раёнах.

Пасля заканчэння нарады жыхары Касцюковічаў чакалі размовы з Прэзідэнтам. Ён адзначыў, што кожны з іх павінен сам адчуваць адказнасць за будучыню свайго рэгіёна, а дзяржава дапаможа там, дзе гэта асабліва неабходна.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Ажыўленне кампаніі чакаецца з пачаткам восені

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На гэты момант Цэнтральная камісія рыхтуе наступнае пасяджэнне, якое пройдзе 28 жніўня і будзе прысвечана пытанням работы кандыдатаў са СМІ, паведаміла старшыня ЦВК. «Гэта пытанні размеркавання эфірнага часу, вызначэнне друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, дзе будуць публікавацца перадвыбарныя праграмы кандыдатаў у дэпутаты, і фарміраванне Назіральнага савета па інфармацыйных спрэчках, — сказала Лідзія Ярмошына. — Папярэдне мы ўжо прапанавалі міністру інфармацыі спіс кандыдатур, бо яны рэкамендуюцца ім. Гэта, па традыцыі, будзе орган пад кіраўніцтвам першага намесніка міністра інфармацыі».

ЦВК плануе, што ўсе кандыдаты ў дэпутаты, якія будуць балатавацца па горадзе Мінску, атрымаюць эфірны час на канале «Беларусь 3», тыя, хто будзе балатавацца па Мінскай вобласці — «СТВ», тым, хто будзе балатавацца па абласцях, свой эфірны час дадуць абласныя тэлерадыёкампаніі. Выступленні па радыё прапануюцца толькі на дзяржаўных абласных радыёстанцыях і на «Радыё-Мінск». Што датычыцца друкаваных выданняў, плануецца, што перадвыбарныя праграмы можна будзе размясціць у двух цэнтральных газетах: «Звязда» і «Рэспубліка». У якасці альтэрнатывы кандыдатам будзе прапанавана таксама магчымасць размясціць праграмы ў абласных або раённых і гарадскіх газетах. Там, дзе акруга складаецца з некалькіх раёнаў, можна будзе надрукаваць сваю праграму ў кожнай раённай газеце акругі.

Акрамя таго, на наступным пасяджэнні ЦВК будзе прынятая пастанова аб парадку дэклaравання маёмасці і даходаў кандыдатаў у дэпутаты.

Лідзія Ярмошына паведаміла журналістам, што пакуль у ЦВК не паступала скаргаў на мясцовыя органы ўлады.

«Усе мясцовыя ўлады адкрылі на сваіх афіцыйных інтэрнэт-парталах спецыяльную рубрыку, дзе апублікавалі тэрмін і месца прыёму дакументаў па вылучэнні ў склады акруговых выбарчых камісій. У канцы жніўня ўсе мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы павінны прыняць рашэнне аб месцах, якія будуць забароненыя для правядзення пікетаў па зборы подпісаў», — дадала яна.

Лідзія Ярмошына таксама нагадала, што збор сродкаў на перадвыбарную кампанію ў Беларусі строга рэгламентаваны. Сродкі можна збіраць у асабісты фінансавы фонд кандыдата ў дэпутаты толькі пасля рэгістрацыі кандыдата. «Да таго ж, іх нельга збіраць праз інтэрнэт, бо гэта ўсё падкантрольна: уносіць грошы могуць толькі грамадзяне Беларусі, пры гэтым паўналетнія. Таму гэта робіцца праз адкрыццё рахунку ў Беларусбанку, куды могуць паступаць грошы ад грамадзян і юрыдычных асоб: да пяці базавых велічынь ад грамадзяніна, і да 10 базавых велічынь — ад кампаніі. Уся сума — 1000 базавых велічынь або 25 500 рублёў — можа быць унесеная і самім грамадзянінам, які ўдзельнічае ў перадвыбарнай гонцы», — давяла старшыня ЦВК.

Яна адзначыла, што перыяд правядзення кампаніі вельмі спрыяльны для выбараў. «Кампанія праходзіць, як мне здаецца, у палітычна стабільных умовах», — сказала Ярмошына.

Характарызуючы спецыфіку беларускіх выбарчых кампаній у цэлым, параўноўваючы іх з замежнымі, Лідзія Ярмошына адзначыла, што «ў нас выбары сацыяльныя». Так, кандыдаты бясплатна атрымліваюць вялікія магчымасці для перадвыбарчай агітацыі — выступленні ў дзяржаўнай прэсе, удзел у тэледэбатах і г. д.

Старшыня ЦВК нагадала, што ў Беларусі няма галасавання па партыйных спісах. «І таму ў нас немагчыма прыкрыцца папулярным брэндам — кожны павінен нешта з сябе ўяўляць», — падкрэсліла яна.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама дадала, што не бачыць нічога, што ашаламляльным чынам адрознівала б цяперашнюю выбарчую кампанію ад папярэдніх. Аднак асаблівасці ёсць. Так, плануецца больш шырока выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі. «Хутка запрацуе праграма для мабільных тэлефонаў, дзе можна будзе вызначыць месцазнаходжанне выбарчага ўчастка і пазнаць нумар выбарчай акругі. Гэта вялікая дапамога для зборшчыкаў подпісаў», — анансавала адно з нававядзенняў Лідзія Ярмошына.

Сёлета арганізатары выбараў будуць яшчэ больш узмоцнена працаваць над забеспячэннем правоў асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, дадала яна. Так, усім тэлеканалам прапанавана, і яны пагадзіліся забяспечыць субцітрамі выступленні кандыдатаў. Акрамя таго, на выбарчых участках будуць ствараца спецыяльныя месцы для галасавання людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. «Гэта значыць альбо будуць ствараца спецыяльныя, больш шырокія кабіны для галасавання, альбо выдзяляцца месцы з нізкім сталом», — сказала старшыня Цэнтрвыбаркама.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# Юбілейны генетычны пашпарт

**У Рэспубліканскім цэнтры геномных біятэхналогій Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі такія дакументы для жыхароў Беларусі і іншых краін складаюцца з 2010 года. 14 жніўня Інстытут генетыкі чакаў свайго 15-тысячнага кліента.**

Генетычны пашпарт — гэта дакумент, у якім прыводзяцца звесткі аб генетычных асаблівасцях чалавека. Менавіта гены ў вялікай ступені адказныя не толькі за нашу знешнасць і здольнасці, але і за наша здароўе. Таму вельмі важна вызначыць, да якіх захворванняў у чалавека ёсць схільнасць, асабліва калі яны залежаць не толькі ад генаў, але і ад ладу жыцця. Калі такая схільнасць выяўлена, можна правесці прафілактыку і прадухіліць хваробу.

У цэнтры праводзіцца тэсціраванне на генетычную схільнасць да сардэчна-сасудзістых захворванняў, дыябету, астэапарозу, метабалічнага сіндрому. Тэсціруюцца і спартсмены для выяўлення спрыяльных і неспрыяльных для спорту генетычных асаблівасцяў. Найбольш запатрабаваная паслуга — выяўленне генетычных прычын невынашвання цяжарнасці. Большая частка генетычных пашпартоў выдадзена жанчынам менавіта з гэтай праблемай.

Генетычны аналіз у тым ліку дазваляе вызначыць індывідуальную адчувальнасць да лекаў. Лабараторыя генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН адзіная ў СНД мае міжнародную акрэдытацыю ў галіне генетычнага аналізу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Аты-баты

# ЗА МЕСЯЦ ДА ВЯЛІКІХ ВУЧЭННЯЎ


Фота БелТА.

**Сумеснае аператыўнае вучэнне «Шчыт Саюза — 2019» пройдзе з 13 да 19 верасня на палігоне паблізу населенага пункта Муліна Ніжагародскай вобласці Расіі. Пра гэта на брыфінгу паведаміў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ. Ён будзе кіраваць ходам вучэння ад беларускага боку. Ад Расіі аналагічныя абавязкі ўскладзены на камандуючага войскамі Заходняй ваеннай акругі Узброеных Сіл Аляксандра Жураўлёва.**

— Вучэнне «Шчыт Саюза — 2019» — гэта заключны этап двухгадовага цыкла сумеснай падрыхтоўкі Узброеных Сіл Беларусі і Расіі, — зазначыў Алег Белаконеў. — Яно носіць планавы характар і праводзіцца раз на два гады па чарзе на тэрыторыі кожнай з краін. Задума вучэння распрацавана з улікам аналізу магчымых варыянтаў узнікнення ваеннай пагрозы Саюзнай дзяржаве і разгортвання ваеннага канфлікту. Практыка паказвае, што ён пачынаецца з дзеянняў тэрарыстаў, сепаратыстаў, іншых незаконных узброеных фарміраванняў. Іх падтрымліваюць трэція сілы. Гэты варыянт і будзе адпрацаваны падчас вучэння.

Апошнім часам вучэнні аб'яднаных узброеных сіл блока НАТА праходзяць ва Усходняй Еўропе паблізу нашых граніц. Разам з тым «Шчыт Саюза — 2019» было вырашана праводзіць не на пагранічных палігонах, а ў глыбіні тэрыторыі Расіі. Зроблена гэта з улікам таго, каб не абвастраць абстаноўку у Еўропе. А яшчэ — паказаць зацікаўленасць нашага боку знізіць градус напружання.

Вучэнне будзе праводзіцца ў два этапы.

Першы з іх працягнецца трое сутак. На ім будуць адпрацаваны пытанні прымянення рэгіянальнай групоўкі войскаў. Злучэнні і воінскія часці будуць непасрэдна на месцах вырашаць задачы, скіраваныя на недапушчэнне дэстабілізацыі абстаноўкі ў зонах адказнасці. Таксама яны падрыхтуюцца да баявых дзеянняў ва ўмовах нанясення праціўнікам ракетных і артылерыйскіх удараў.

Другі этап разлічаны на чацвёра сутак. Ён будзе прысвечаны пытанням кіравання войскамі, падтрымання ўзаемадзеяння і іх усебаковага забеспячэння падчас абарончых дзеянняў. А таксама — стабілізацыі абстаноўкі.

— Варта зазначыць, што колькасць ваеннаслужачых і баявой тэхнікі, якія ўдзельнічаюць у вучэнні, не перавышае ўзровень, вызначаны для абавязковага назірання ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі, — кажа Алег Белаконеў. — Так, у ім будзе задзейнічана каля 12 тысяч вайскоўцаў, да 950 адзінак тэхнікі і каля 70 самалётаў і верталётаў. Аб гэтым Расія загадзя паведаміла дзяржавам — удзельніцам АБСЕ, згодна з нормамі Венскага дакумента 2011 года.

Ад Беларусі ў Ніжагародскую вобласць адправіцца больш за чатыры тысячы чалавек асабовага складу, больш за 30 танкаў, 80 баявых браніраваных машын, каля 50 рэактыўных сістэм залпавага агню і мінамётаў. Паветраны эшалон складуць паўтара дзясятка самалётаў і верталётаў.

Назад у пункты пастаяннай дыслакацыі ў Беларусі яны вернуцца да 4 кастрычніка.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Як нас дураць

# Крадуць грошы з картак

**Гэтымі днямі жыхарам Гродна тэлефанавалі з розных нумароў невядомыя грамадзяне. Чалавек на другім канцы провада прадстаўляўся супрацоўнікам фінансавай установы і казаў, што з пластыкавай карткай могуць быць праблемы, а для таго, каб іх вырашыць, неабходна ўдакладніць усе адпаведныя рэквізіты плацежнага сродку.**

Заклапочаныя грамадзяне перадавалі неабходную інфармацыю «фінансісту», а як вынік — праз некаторы час з іх рахункаў знікалі грошы. На 13 жніўня ў Кастрычніцкі РАУС Гродна з падобнымі заявамі звярнуліся восем грамадзян. У аднаго з пацярпелых выкрадзена 800 рублёў.

Паводле слоў **першага намесніка начальніка Кастрычніцкага РАУС горада Гродна падпалкоўніка міліцыі Вячаслава ДЗЕМІДОВІЧА,** пры правядзенні праверкі праваахоўнікам удалося ўстанавіць, што зламыснікі выкарыстоўвалі камп'ютарную праграму, якая змяняе нумар тэлефона. Дачыненне рэальных уладальнікаў нумароў да таго, што адбывалася, не пацвярджаецца. «Цяпер мы праводзім комплекс аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў, накіраваных на ўстанаўленне асобы ці групы асоб, якія ўчынілі гэтае дзеянне. Хацелася б нагадаць грамадзянам, што нікому нельга перадаваць рэквізіты сваёй банкаўскай карткі. Супрацоўнікі фінансавай установы, банка не будуць прасіць вас прадставіць падобную інфармацыю, тым больш — з дапамогай званкоў», — расказаў Вячаслаў Дземідовіч.

# ...БО ПРОЗВІШЧА БЫЛО АДНОЛЬКАВАЕ

**Гісторыя гэтая, як паведаміў афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь ПРЫСТРОМАЎ, пачалася яшчэ ў красавіку гэтага года, калі ў офіс аднаго з аператараў сотавай сувязі ў Гомелі звярнуўся абуралы кліент. Мужчына не разумеў, чаму ён павінен выплачваць растэрміноўку за тэлефон, які не купляў. Разбірацца ў перыпетыях справы пачалі супрацоўнікі БЭЗ Цэнтральнага РАУС г. Гомеля.**

Вывучыўшы фінансавую дакументацыю, аператыўнікі высветлілі, што дамову на продаж сотавага тэлефона аформіў спецыяліст па рабоце з кліентамі з такім самым прозвішчам, як і ў таго абуранага гамяльчаніна.

Супрацоўнік кампаніі, даведаўшыся, што ім усур'ёз зацікавіліся праваахоўныя органы, адмоўчвацца не стаў і расказаў пра схему сваіх незаконных продажаў.

Малады чалавек вырашыў зарабіць на перапродажы сотавых тэлефонаў. «Пакупнікамі» выступілі яго сваякі. Па надуманых падставах ён браў у іх пашпарты і афармляў куплю мабільнікаў у растэрміноўку. Стрыечныя і траюрадныя сёстры, браты, дзядзькі і цёткі, натуральна, нават і не ведалі пра тое, што набылі дарагі тавар. Мабільнікі, дарэчы, выбіраліся нятанныя, ад тысячы рублёў і вышэй. Але, каб палегчыць фінансавую нагрузку, тэрмін растэрміноўкі ставіўся максімальна працяглы.

Затым гамяльчанін размяшчаў аб'явы аб продажы сотавых прылад на гандлёвых інтэрнэт-пляцоўках. «Трубкі» сыходзілі хутка, бо кошт быў значна ніжэйшы за рыначны. Атрыманыя такім чынам грошы трацілася на даўгі і забавы. З канца кастрычніка 2018-га да красавіка 2019-га хлопец паспеў аформіць у растэрміноўку 13 апаратаў сотавай сувязі на агульную суму 14 286 рублёў.

Па гэтай справе (крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі) міліцыяй узбуджана крымінальная справа. Аператыўнікам ужо ўдалося знайсці восем сотавых тэлефонаў, прычым не толькі ў Гомелі, але і ў Гродне, Мінску, Рэчыцы. А спецыяліст па рабоце з кліентамі часткова кампенсаваў шкоду.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

Стыхія

# У АЎТОРАК, 13-га...

## Ад навальніцы пацярпелі Брэсцкая і Гомельская вобласці

Паводле аператыўных звестак МНС, ад моцнага ветру 13 жніўня (да 20 м/с) пацярпелі 19 населеных пунктаў у Брэсцкім, Іванаўскім, Кобрынскім і Пінскім раёнах Брэсцкай вобласці. Пашкоджаны дахі шасці жылых дамоў, 65 сельскагаспадарчых будынкаў, будынак сельсавета Савета і 73 гектары лесанасаджэнняў. Зафіксавана 67 выпадкаў падзення дрэў на праезную частку і прыватныя падворкі.

Электразабеспячэнне населеных пунктаў і аб'ектаў не парушалася. Падзенні дрэў зафіксаваны ў Брэсцкім (32 выпадкі), Кобрынскім (8), Іванаўскім (25), Пінскім (2) раёнах. Затрымак руху транспарту не адбылося. Для распілоўкі дрэў былі прыцягнуты 21 адзінка тэхнікі, 69 работнікаў. З іх 8 адзінак тэхнікі і 24 работнікі МНС, 13 адзінак тэхнікі і 45 работнікаў спецыялізаваных службаў (ЖКГ, ДРСУ, дарожна-эксплуатацыйныя прадпрыемствы).

З-за навальніцы ў Гомельскім раёне было парушана электразабеспячэнне 39 населеных пунктаў, 17 малочнатаварных фермаў, 12 зернесушыльных комплексаў. Адключаліся ад электразабеспячэння населеныя пункты ў трох сельсаветах Гомельскага раёна. Як мяркуецца, прычына адключэння — падзенне дрэў на лініі электраперадачы. Па інфармацыі МНС, пацярпелых няма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ну і ну!

# ГОЛАЕ СЭЛФІ Ў КРАМЕ

**За злоснае хуліганства, здзейсненае групай асоб, у Магілёве ў дачыненні да чатырох 18-гадовых хлопцаў распачата крымінальная справа. Акалічнасці здарэння не зусім звычайныя...**

Па інфармацыі УСК па Магілёўскай вобласці, ноччу маладыя людзі распівалі спіртныя напоі па месцы жыхарства аднаго з іх. Калі алкаголь скончыўся, хлопцы пайшлі па дабаўку ў начную краму. Перад выхадам, вырашыўшы праявіць п'яную зухаватасць, падазраваныя знялі штаны, пакінуўшы іх у кватэры. Па дарозе маладыя людзі пашкодзілі люстэрка задняга віду ў двух аўтамабілях, а таксама перашкаджалі праезду аўтамабіляў. Затым знялі ўсю астатнюю вопратку і голымі зайшлі ў краму. Адзін з кампаніі дэманстратыўна сеў на месца касіра, каб зрабіць фота для сацыяльнай сеткі. Усе свае дзеянні маладыя людзі здымалі на камеру мабільнага тэлефона. Па дарозе дадому падазраваных былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі. Вырашаецца пытанне аб прымяненні да іх меры стрымання. Устаноўлена, што адзін з хлопцаў раней судзімы за рабаванне і незаконны абарот наркатычных сродкаў.

Следчымі падазраваныя дапытаныя, іх паказанні дапасоўваюцца і дапаўняюць адно аднаго. Канфіскаваны мабільны тэлефон, на камеру якога маладыя людзі здымалі свае дзеянні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Долар становіцца пагрозай эканоміцы ЗША



Імклівы рост долара наносіць шкоду амерыканскай эканоміцы, піша Bloomberg. Некаторыя ўдзельнікі рынку асцерагаюцца, што гэта можа выклікаць рэцэсію. Адзначаецца, што ўмацаванне курса мае тэндэнцыю негатыўна адбівацца на прыбытку транснацыянальных кампаній ЗША, а таксама павышае выдаткі для замежных карпарацый, якія маюць даўгавыя абавязацельствы на трыльёны долараў. У прыватнасці, негатыўны ўплыў адчуваюць на сабе такія кампаніі, як Coca-Cola, Caterpillar, Boeing. Эканамісты лічаць, што любое далейшае ўмацаванне амерыканскай валюты можа стаць выклікам для сусветнай эканомікі. Morgan Stanley і Brandywine Global Investment Management бачаць у дынаміцы патэнцыйны каталізатар наступнай рэцэсіі ў ЗША і свеце і прагназуюць абвал курса на 25 працэнтаў на працягу наступных пяці гадоў. На фоне хісткага становішча долара эканамісты ўсё часцей робяць выбар на карысць паўднёвакарэйскай воны, чэшскай кроны, новазеландскага долара, японскай іены і швейцарскага франка.

## Армузскі праліў прызналі зонай павышанай рызыкі

Армузскі праліў прызнаны часовай зонай павышанай рызыкі, што забяспечвае для маракоў, якія працуюць у гэтым раёне, дадатковыя бонусы, паведаміла прэсслужба Расійскага прафесійнага саюза маракоў (РПСМ). Увечары 19 ліпеня ВМС Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі (КВІР, частка ўзброеных сіл Ірана) затрымалі ў Армузскім праліве ў іранскіх тэрытарыяльных водах брытанскі танкер Stena Impero і пасля суправадзілі яго ў порт Бэндэр-Абас. Экіпаж танкера, які складаецца з 23 чалавек застаецца на борце. Іранскія ўлады заявілі, што танкер стаіць на якары каля порта. «Мы працягваем заклікаць да спакою ў гэтым раёне плавання і вызвалення экіпажа», — прыводзяцца ў паведамленні РПСМ словы старшыні секцыі маракоў Міжнароднай федэрацыі транспартных рабочых (ITF) Дэвіда Хендэля.



## Брытанцы масава скупляюць прадукты першай неабходнасці



Як адаб'ецца выхад Злучанага Каралеўства з ЕС на эканоміцы краіны, пакуль дакладна ніхто не ведае, але прагнозы паступаюць ад умерана песімістычных да проста катастрафічных. На гэтым фоне брытанцы пачалі масава скупляць тавары першай неабходнасці. Да разводу з ЕС рыхтуюцца проста як да вайны, адзначае Euronews. Паводле ацэнак экспертаў, толькі за апошнія месяцы жыхары каралеўства выдаткавалі больш за 4 мільярды фунтаў, папаўняючы запасы ежы, напояў, а таксама лекаў. Новаабраны брытанскі прэм'ер Борыс Джонсан паабяцаў вывесці Злучанае Каралеўства з ЕС да 31 кастрычніка, прычым незалежна ад таго, ці будзе дасягнута належнае пагадненне з Бруселем ці не. Джонсан вядомы сваёй прынцыповай пазіцыяй датычна брэксіту, таму асцярогі экспертаў і прадстаўнікоў бізнесу ў цэлым не марныя. Агульная нервовасць адбіваецца на фондавых і валютных рынках. За мінулыя тыдні курс фунта апусціўся да мінімальнай адзнакі ў адносінах да еўра з 2016 года, калі, уласна, брытанцы і прагаласавалі за выхад з ЕС. У сувязі з гэтым кіраўнік Банка Англіі Марк Кэрні заявіў, што «жорсткі брэксіт» прывядзе да рэальнага эканамічнага шоку для краіны.

# ШТО Ў МЕНЮ ШКОЛЬНІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нагадаем, што Камбінат школьнага харчавання быў створаны ў Мінску ў лістападзе мінулага года. Гэтай установе, паводле слоў **начальніка аддзела выхаваўчай работы Мінгарвыканкама Ганны РЫСЯВЕЦ,** было перададзена абсталяванне і абедзеныя залы ва ўсіх школах Мінска. З мінулага навучальнага года складаецца адзінае для ўсіх школ сталіцы меню, яно мае асенні, зімовы і вясновы варыянты. Летась было распрацавана каля 30 найменняў страў. Іх апрабавалі ў школах, якія з'яўляюцца базавымі пляцоўкамі камбіната. Дэгустацыі праводзіліся як сярод вучняў, так і сярод іх бацькоў. Сёлета практыка выкарыстання адзінага для ўсіх сталічных школ меню працягнецца. Упадабаныя мінскімі школьнікамі стравы ў ім застануцца. Некаторыя менш папулярныя — напрыклад, сечанікі з рыбы і «Бел-Нагетс» — вырашана выключыць. Меню прайшло першасную ацэнку і будзе рэкамендавана для школьнага харчавання.



## З элементамі шведскага стала

Яшчэ адна з навінак школьнага харчавання — шведскі стол. Спецыялісты падкрэсліваюць, што ў школах такі спосаб падачы ежы выкарыстоўваецца не цалкам, а толькі асобныя яго элементы. Вучням прапануюць дзве гарачыя стравы на выбар, два гарніры і дзве салаты, з якіх дзіця само складае комплекс. Пакуль такая сістэма існуе толькі ў некаторых школах Фрунзенскага раёна сталіцы.

— Укараніць сістэму харчавання з элементамі шведскага стала ва ўсіх школах праблематычна па прычыне пабудовы тэхналагічнага працэсу, — тлумачыць Марына Дзякава. — У нас ёсць школы, дзе вучыцца тры тысячы вучняў. Накарміць усіх за 15-хвілінныя перапынкі, якія адводзяцца на абед, проста не атрымаецца.

У Беларусі больш за 96 % школьнікаў атрымлівае гарачае харчаванне. Яно прыгатавана ашчаднымі спосабамі, без выкарыстання вострых прыправаў і соусаў, без камбінаваных тлушчаў, вэнджаніны, маянэзаў, расказала **Ангеліна МІЦКОВІЧ, урач-гігіеніст аддзялення дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.** Каб заставацца здаровымі, мяса, гародніну, фрукты, сокі дзеці павінны ўжываць штодзённа, рыбу і тварог — два-тры разы на тыдзень. Школьнае меню складаецца на аснове прыкладных рацыёнаў, куды ўваходзяць усе неабходныя прадукты. Ужо працяглы час у школах забаронена выкарыстанне чыпсаў, салодкіх газіраваных напояў, сасіскі ўжываюцца абмежавана — не больш за раз на тыдзень. Перагледжаны і асартымент буфетнай прадукцыі: абмежаваны продаж піцы, сасісак у цесце, смажанак. Летась было вырашана знізіць нормы выкарыстання солі (на 30 %) і цукру (на 20—25 %).

Перапынак паміж прыёмамі ежы ў школьнікаў не павінен перавышаць 3,5-4 гадзін. У залежнасці ад таго, колькі вучні знаходзяцца ў школе, яны атрымліваюць або гарачы сняданак ці абед, або двух-трохразовае харчаванне (калі наведваюць групу прадоўжанага дня).

## Абед за 2,5 рубля

У новым навучальным годзе абед у школьнай сталоўцы будзе каштаваць у межах 2,3-2,5 рубля. Бясплатным харчаваннем па-ранейшаму забяспечваюцца ўсе вучні пачатковай школы, а ў сельскай мясцовасці — 1—11 класаў. Таксама за сродкі бюджэту харчуюцца дзеці льготных катэгорый, у тым ліку са шматдзетных сем'яў. Каля 56 % беларускіх школьнікаў атрымлівае ў школе бясплатнае харчаванне.

Паступова паляпшаецца і стан саміх харчаблокаў, што таксама ўплывае на якасць школьнага харчавання. Паводле слоў Ангеліны Міцковіч, штогод каля сотні харчаблокаў капітальна рамантуецца. Набываецца сучаснае абсталяванне, у прыватнасці параканвектаматы. Сёння яны ёсць у 20 % школ (у сталіцы гэта лічба складае 36 %), а яшчэ два гады таму іх было ўдвая менш. Адметна, што і санітарных парушэнняў апошнім часам у сістэме школьнага харчавання выяўляецца ў 1,5-2 разы менш. Санітарная служба правярае, у прыватнасці, стравы на адпаведнасць рэцэптуры і ўтрыманне вітамінаў і карысных рэчываў, бярэ на бактэрыялагічны аналіз змывы з тэхналагічнага абсталявання і г. д.

У сталіцы сёлета рамантаваліся 30 харчаблокаў, у 22 з іх работы ўжо скончаны, у 8 завяршаюцца. Запланавана набыццё 419 адзінак абсталявання. У школы з вялікай колькасцю вучняў набываецца абсталяванне для падагрэву посуду (яно дазваляе захаваць ежу гарачай працяглы час), сервіровачныя цялежкі, сучасны прыборачны інвентар, паведаміла **загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Таццяна АСТРОЎСКАЯ.**

## У рацыёне шмат солі і цукру

Апошнім часам беларусы сталі харчавацца больш правільна. У прыватнасці, сталі ўжываць менш хлеба, бульбы, круп. У рацыёне павялічылася колькасць мяса і гародніны. Але разам з тым мы ўсё яшчэ зашмат ужываем солі і цукру, рафінаваных вугляводаў.

— Здаровае харчаванне — гэта не дыета, а тая ежа, якая спрыяе захаванню здароўя, каб захворванні, якія ёсць, не прагрэсавалі, а нават змяншаліся. Рацыянальнае і правільнае харчаванне — гэта

**Летась было распрацавана каля 30 найменняў страў. Іх апрабавалі ў школах, якія з'яўляюцца базавымі пляцоўкамі камбіната. Дэгустацыі праводзіліся як сярод вучняў, так і сярод іх бацькоў.**

і захаванне рэжыму, і спалучэнне яго з фізічнай нагрузкай, — тлумачыць **галоўны пазаштатны дыетолаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Марына ПАПОВА.** — Важнае і захаванне пітнога рэжыму. Штодзень трэба выпіваць вадкасці з разліку 30 мілілітраў на кілаграм вагі. У дастатковай колькасці ў арганізм павінны паступаць бялкі, яны складаюць каля 15 % сутачнага каларажу. Бялкі карысныя як раслінныя, так і жывёльныя. Нельга адмаўляцца ад мяса, малочных прадуктаў, круп. Трэцюю частку рацыёну складаюць тлушчавыя кампаненты — раслінныя і жывёльныя. Не адмаўляйцеся ад сметанковага масла і алею. Вугляводы забяспечваюць максімальную энергетычнасць рацыёну — 50 %. Ёсць «дрэнныя» вугляводы — цукар, мучныя і кандытарскія вырабы. А ёсць і карысныя вугляводы, якія мы атрымліваем з гародніны, фруктаў, злакаў.

Спецыяліст паведаміла, што, паводле даследавання, 40 % беларусаў лічыць, што вядуць здаровы лад жыцця. Астатнія асноўнай прычынай няправільнага харчавання называюць адсутнасць матывацыі, настойлівасці і ўпартасці, а не грошай ці часу.

**Вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра гігіены Ірына КЕДРОВА** расказала, што негатыўныя моманты часцей сустракаюцца ў харчаванні пажылых людзей і дзяцей, асабліва падлеткаў. У рацыёне беларусаў недастаткова кальцыю, вітаміну Д і іншых, у жанчын фертыльнага ўзросту зніжана ўжыванне жалеза.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Гігіенічны лікбез для выхавальнікаў і кухараў

**Пастановай Савета Міністраў ад 7 жніўня 2019 года № 525 зацверджаны санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні да ўтрымання і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі.**

Дакументам устанаўліваюцца агульныя патрабаванні да размяшчэння ўстаноў адукацыі і іх тэрыторыі, планіровачнай структуры будынкаў, асвятлення, абсталявання памяшканняў, арганізацыі адукацыйнага працэсу і выхавання, вытворчага навучання, арганізацыі практыкі, распарадку дня, медыцынскага забеспячэння навучэнцаў, арганізацыі харчавання навучэнцаў.

Пастановай вызначана, што прыём (паступленне) дзіцяці ў адукацыйную ўстанову пасля перанесенага захворвання павінен ажыццяўляцца па прадстаўленні медыцынскай даведкі аб стане здароўя. Пры прыёме ва ўстанову для дзяцей-сірот дадаткова да медыцынскай даведкі падаецца выпіска з медыцынскіх дакументаў.

Згодна з санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі, для некаторых работнікаў устаноў адукацыі прадугледжана абавязковае гігіенічнае навучанне: гэта датычыцца работнікаў аб'ектаў харчавання — перад іх паступленнем на работу і ў далейшым адзін раз у год; кіраўнікоў, выхавальнікаў і памочнікаў выхавальнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, прыбіральшчыкаў памяшканняў, работнікаў плавальных басейнаў і пральняў, загадчыкаў гаспадаркі, намеснікаў кіраўнікоў па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце — перад паступленнем на работу і ў далейшым адзін раз у два гады.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Не прапусці!

# Дзе прадэгуставаць фермерскую прадукцыю?

**Кірмаш арганічнай і экалагічнай ежы пройдзе ў Мінску 25 жніўня. Гэта трэці, завяршальны маркет серыі «У гармоніі з прыродай».**

Яго арганізатарам выступае экалагічная ўстанова «Агра-Эка-Культура» ў партнёрстве з грамадскім аб'яднаннем «Экадом» пры падтрымцы Coalition Clean Baltic.

Увазе гасцей будуць прапанаваныя арганічныя гародніна, зяленіва, ягады, садавіна, яйкі, крупы, хлеб на заквасцы з печы, хатняя выпечка, духмяны мёд, казінае малако, сыр, тварог з магчымасцю дэгустацыі фермерскай прадукцыі.

Наведвальнікі змогуць асабіста пазнаёміцца з фермерамі, даведацца, як і што яны вырошчваюць. Сярод прадаўцоў — фермеры, сертыфікаваныя па нормах арганічнай сельскай гаспадаркі ЕС. Хто захоча, зможа дамовіцца з імі аб рэгулярнай дастаўцы арганічных прадуктаў.

«Для чаго патрэбныя такія маркеты? Шмат хто хоча купіць арганічныя і экалагічныя прадукты, але не ведае дзе. З іншага боку, арганічным фермерам цяжка знайсці свайго пакупніка. Наш кірмаш — месца, дзе яны могуць сустрэцца», — падкрэслівае **старшыня праўлення экалагічнай установы «Агра-Эка-Культура», кандыдат сельскагаспадарчых навук Лана СЕМЕНАС.**

У рамках мерапрыемства для дзяцей і дарослых будуць ладзіцца майстар-класы, латарэі, у якіх галоўным прызам стануць фермерскія прадукты. Таксама можна будзе атрымаць кансультацыю экспертаў і набыць літаратуру, прысвечаную арганічнай сельскай гаспадарцы.

Кірмаш пройдзе з 12.00 да 16.00 у культурным цэнтры «Корпус» (Машэрава, 9/8). Уваход бясплатны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Сямейная газета

Выпуск № 13 (128)

# ЛЮСТЭРКІ ЭПОХІ

*Кожнае наступнае пакаленне хоча вылучацца і адрозніваецца ад папярэдніх, пакінуць свой след — у адзенні, прычосках, музыцы... І канешне, вынаходзіць адмысловы слэнг, гэткі маркер вызначэння «сваіх». Некалі заліхвацкія «шасцідзясятнікі» і сучаснае «пакаленне Z» гавораць у літаральным сэнсе на розных мовах, хоць часта гэта ўсё тая ж сумесь ніжагародскай і французскай, толькі пад іншым соусам.*

*Напрыклад, у 90-я моладзь прыдумала слоўца «бадзяжыць» — у сэнсе, змешваць розныя напоі, пераважна алкагольныя, а з рэкламных ролікаў падлеткі ўзялі «баўнці» як абазначэнне рамантычных стасункаў. Прыкладна адтуль жа родам «лавэ», «ездзіць па вушах», «кіпеш» і неўміручае «па ходу».*

*Падлеткі — аднагодкі маёй малодшай сястры на пачатку 2000-х не любілі «глюкі» і «часопіс Грузілка», казалі дзіўнае «зэбска» замест «добра» і «лахалі», а не смяяліся. Заўсёднікаў першых інтэрнэт-клубаў можна было лёгка пазнаць па «прэведах», «лолах», «КГ/АМ» і іншых выразах, геймеры «рубіліся ў контру» па начах, а таму клявалі носам на ўроках ці ўніверсітэцкіх парах. Дарослыя, канешне, раздражняліся і крытыкавалі гэту «папугайскую мову». Пры гэтым, калі задацца мэтай і настойліва распытаць старэйшае пакаленне сваякоў пра іхнюю маладосць, вы даведаецеся, што яны і самі ў 60-х эпаціравалі шаноўную публіку рознымі там «шузамі» (супрацьпастаўленне замежнага моднага абутку небагатаму выбару ў савецкіх крамах), «хілялі па Брадвеі» (гулялі па цэнтральнай вуліцы любога горада) і папярэджвалі «карашоў», што сустрэча пераносіцца з кватэры на вуліцу, бо «шнуркі ў шклянцы» (бацькі дома). У 70-я вальнадумныя студэнты змагаліся з жаданнем правільных дарослых «папіліць ім хаер» (пастрыгчы валасы), «сцябаліся» з нямодных «прыкідаў» (адзення), а некаторыя нават «дрынчалі да крэйзы» (пілі да страты памяці). Яшчэ праз дзесяць год сярод нефармальнай моладзі было звычайнай справай «тусіць па сэйшнах» (хадзіць на канцэрты), падарожнічаць «стопам» (аўтаспын) у кампаніі «сістэр» (дзяўчат) і характарызаваць словам «нішцяк» усё, што падабалася. Такім чынам, калі шчыра пагутарыць з чалавекам у нефармальнай абстаноўцы, то па некалькіх фразах — люстэрках эпохі можна зразумець, з якога ён пакалення.*

*Цяпер ва ўжытку іншыя словы і паняцці — «хайп», «хейт», «спойлер»... Кліпавае мысленне і, як казаў наш універсітэцкі выкладчык, тэндэнцыя да эканоміі маўленчых намаганняў прыводзяць да ўсё большага распаўсюджвання скарачэнняў: «ок», «норм», «сап» (скарачэнне ад what's up— «як справы»). А мы з вамі, каму за 35, — «олдскул», мода мінулага часу. Нязгодныя? Ну, паспрабуйце сходу перакласці — з нядаўняй рэкламы рэальнага мерапрыемства — «олдскульны фестываль стрытфуду». Ведаеце, пра што гаворка? Пра ежу, што прадавалася ў кіёсках, светлая ім памяць, у канцы 1990-х — пачатку 2000-х: хадуны, златкі, чабурэкі, слоеныя піражкі, блінчыкі і чамусьці макарона па-флоцкі. Увявіце сабе, для кагосьці гэта ўжо далёкая гісторыя...*

*Часам лаўлю сябе на тым, што пачынаюць раздражняць уласцівыя сучаснаму слэнгу англіцызмы: «лайн-ап» (спіс артыстаў, заяўленых на фестываль), «шэрыць» (дзяліцца допісам у сацсетках), «ту мач» («занадта многа» альбо проста «занадта»), «чэлендж» замест «выклік» і г. д. Тады я проста падыходжу да люстэрка і кажу сабе «Старэеш, цётка». І адпускае. Нічога ж страшнага не адбываецца. Калі нешта незразумела, спытаю: калі не ў дзяцей, то ў «Гугла». А цяперашнія падлеткі рана ці позна таксама вырастуць — і пачнуць змагацца за чысціню мовы і «тармазіць» над слэнгам ужо сваіх дзяцей.*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Бацькоўскі клуб

# ДЗЯЎЧЫНКА І КРАКАДЗІЛ,

## або Правілы выхавання маленькіх паненак ад пісьменніка Паўла ГУШЫНЦА



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Тата, Соня і кракадзіл-бегемот.

**ЖЫЛА-БЫЛА дзяўчынка Соня. Хадзіла ў дзіцячы садок, гуляла з хамячком, лялькай Анфісай і трошкі з бацькоўскімі нервамі. Капрызіла. А яшчэ хавала пад сваім ложкам... кракадзіла Мурзіка, карміла яго дамашнімі катлетамі і абмяркоўвала з ім складанасці стасункаў з бацькамі і сябрамі... Гэта не плод нашай бурнай фантазіі, а сюжэт зборніка іранічных апавяданняў «Дзяўчынка і кракадзіл» — першай дзіцячай кнігі пісьменніка Паўла Гушынца, якая летась выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». Адразу скажам, што кніжка хутка разышлася, таму следам за ёй з'явілася другая — «Тата, раскажы пра мяне гісторыю». Увогуле, малады аўтар пачынаў з публікацый у інтэрнэце жыццёвых гісторый пра дактароў і ваенных (па адукацыі ён ваенны доктар), палюбіўся віртуальным чытачам і «матэрыялізаваў» найлепшыя гісторыі ў некалькіх зборніках... Магчыма, ён так бы і працягваў паказваць выключна «праўду жыцця», калі б не прымерыў новую для сябе ролю — ролю бацькі. Дачка Соня не хацела слухаць банальныя сюжэты пра Калабка і Чырвоную шапачку, таму Паўлу давялося падключаць фантазію і прыдумваць казкі самому. З цягам часу гісторый назбіралася столькі, што грэх было не падзяліцца імі з іншымі дзецьмі... Як паказалі шматлікія сустрэчы з чытачамі ў бібліятэках і кніжных крамах, творчасць аўтара «заходзіць» малым на ўра. Напэўна, Павел нядрэнна разбіраецца ў дзіцячай псіхалогіі, а таму мы вырашылі пагутарыць з ім не як з пісьменнікам, а як з бацькам дзяўчынкі Соні: пра ўзаемаадносіны ва ўласнай сям'і і асаблівасці выхавання.**

***(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)***

Да школы гатовы?

# САМАЕ БЯСПЕЧНАЕ МЕСЦА

## Як вера ў дзіця можа дапамагчы вырасціць шчаслівага і паспяховага чалавека

**«Маё дзіця не гатова да школы...» Гэту фразу ад бацькоў шасцігодак даводзіцца чуць даволі часта. Многія з іх стаяць зараз перад складаным выбарам: або падоўжыць бесклапотнае жыццё свайму дзіцяці ў дашкольнай установе яшчэ на год, або ўсё ж такі 1 верасня распачаць адлік школьнай дыстанцыі? Псіхолаг аддзялення псіхалагічнай дапамогі сям'і і дзецям Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольга БЫК расказала чытачам «Сямейнай газеты» пра тое, якія памылкі часта дапускаюць бацькі першакласнікаў і што ў іх сілах зрабіць, каб не азмрочыць знаёмства дзіцяці са школай.**

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сацыяльная кансультацыя

# Да каго прыйдзе сацработнік

? ***Хто мае права на сацыяльнае абслугоўванне на даму? Колькі разоў на тыдзень павінен прыходзіць сацработнік да такога чалавека? (Вялюнова Г. А.)***

**Адказвае дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Савецкага раёна г. Мінска Святлана ПРЫВАЛАВА:**

— Звярнуцца ў Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы свайго жыхарства з нагоды сацабслугоўвання на даму можа кожны пенсіянер пачынаючы з 60 гадоў — незалежна ад таго, жыве ён адзін ці, дапусцім, са сваімі дзецьмі. Акрамя таго, такія паслугі мы аказваем і людзям з інваліднасцю, як правіла, інвалідам I або II групы незалежна ад узросту. Але пры гэтым мы ўлічваем медыцынскія паказанні і (або) адсутнасць медыцынскіх супрацьпаказанняў. Яны прапісаны Міністэрствам аховы здароўя.

У цэлым парадак і ўмовы аказання ТЦСАН сацыяльных паслуг рэгламентаваны «Інструкцыяй аб парадку і ўмовах аказання сацыяльных паслуг дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання», зацверджанай пастановай Мінпрацы і сацабароны ад 26 студзеня 2013 г. № 11.

Пенсіянеру пры звароце да нас неабходна прадставіць наступныя дакументы: пісьмовую заяву (устаноўленай формы); дакумент, які сведчыць асобу; дакумент устаноўленага ўзору аб праве на льготы (пасведчанне інваліда, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны і да т. п.) — для грамадзян, якія адносяцца да катэгорыі тых, хто карыстаецца льготамі; медыцынскую даведку аб стане здароўя (для гэтага трэба звярнуцца да свайго ўчастковага тэрапеўта).

Работнікі ТЦСАН на працягу трох рабочых дзён з дня звароту правядуць абследаванне матэрыяльна-бытавога становішча пенсіянера са складаннем акта і запытаюць у дзяржаўных органаў і іншых арганізацый наступныя звесткі: аб памеры атрыманай пенсіі за месяц, які папярэднічаў звароту, — для адзінокіх непрацаздольных грамадзян; даведку аб месцы жыхарства і складзе сям'і; звесткі аб адсутнасці догляду за грамадзянінам асобай, якая атрымлівае дапамогу па доглядзе за інвалідам I групы або за асобай, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту.

Рашэнне аб заключэнні дагавора аказання сацыяльных паслуг прымаецца дырэктарам ТЦСАН на працягу 5 рабочых дзён пасля атрымання апошняга неабходнага дакумента (звестак).

**АПЛАТА САЦЫЯЛЬНЫХ ПАСЛУГ**

Сацыяльныя паслугі на даму ажыццяўляюцца на ўмовах аплаты (поўнай або частковай) або бязвыплатна.

Правa на бясплатнае сацыяльнае абслугоўванне на даму маюць малазабяспечаныя адзінокія непрацаздольныя грамадзяне, сярэднедушавы даход якіх ніжэйшы за 100 % бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ), які дзейнічае на дату падачы заявы аб аказанні сацыяльных паслуг (нагадаем, што з 1 жніўня БПМ зацверджаны ў памеры 230,92 рубля).

На ўмовах частковай аплаты сацыяльныя паслугі атрымліваюць адзінокія непрацаздольныя грамадзяне, сярэднедушавы даход якіх не перавышае 200 % БПМ. Памер частковай аплаты складае: для непрацаздольнага грамадзяніна — 60 % ад тарыфу на сацыяльныя паслугі; для непрацаздольнай сям'і — 50 % ад тарыфу для кожнага члена сям'і.

Астатнім сацыяльныя паслугі на даму прадстаўляюцца на ўмовах поўнай аплаты па сацыяльных тарыфах, якія зацвярджаюцца мясцовымі органамі ўлады, у нашым выпадку — Мінгарвыканкамам. Так, у Мінску пенсіянер заплаціць за гадзіну працы сацработніка 66 капеек. Сярэдняя працягласць візіту сацработніка — 1 гадзіна 50 хвілін, значыць, поўная аплата за візіт складзе 1,21 рубля. Прыблізна такая ж карціна і ў іншых рэгіёнах. Як бачыце, кожны пенсіянер можа сабе гэта дазволіць.

**КОЛЬКІ ВІЗІТАЎ НА ТЫДЗЕНЬ?**

Для непрацаздольных грамадзян, якія атрымліваюць сацпаслугі без аплаты, перыядычнасць наведвання сацыяльным работнікам устаноўлена з улікам іх крытэрыя жыццядзейнасці (абмежаванняў здольнасці да самаабслугоўвання).

Перыядычнасць наведвання таго, хто абслугоўваецца на ўмовах частковай або поўнай аплаты, устанаўліваецца па жаданні самога пенсіянера на падставе дагавора, у якім вызначаны віды і аб'ём паслуг.

**Святлана БУСЬКО.**

# ХАТНІЯ КЛОПАТЫ

## Малыя з Мазырскага дзіцячага дома жывуць у кватэрах і завіхаюцца на ўласных градках

**На ўскрайку Мазыра на 1,5 гектара зямлі сярод зеляніны і кветак стаіць дом — не проста дом, а адзін з самых старэйшых дзіцячых дамоў Беларусі, якому вось-вось споўніцца 75 гадоў. Нягледзячы на такі сталы ўзрост, будынак і звонку, і знутры самы што ні ёсць сучасны. Яго гадаванцы, дзеці ад трох да васямнаццаці гадоў, жывуць па 10—12 чалавек у кватэрах з вітальняй, гасцінай, гульнявым пакоем, кухняй, асобнымі душавымі для хлопчыкаў і дзяўчынак, спальнямі на аднаго-двух малых... На 200 квадратных метрах кожнага з чатырох такіх памяшканняў змяшчаецца ўсё, што трэба для сямейнага камфорту. А каб ведаць, што такое праца, дзеці разам з выхавацелямі шчыруюць на гародзе і ў цяпліцах. Астатняя тэрыторыя — суцэльны кветнік і фруктовы сад.**


Дырэктар дзіцячага дома Ірына ВІШНЕЎСКАЯ.

### НАДОМНАЯ ЦАРКВА ДЫ ЭТНАГРАФІЧНАЯ ХАТА

Большасць з 35 гадаванцаў дома — сіроты пры жывых бацьках. Каб малыя не страцілі ўяўлення пра тое, што такое сям'я, і своечасова сацыялізаваліся ў грамадстве, кіраўніцтва дома намагаецца ствараць умовы, максімальна набліжаныя да хатніх. Прычым, на думку карэспандэнтаў «СГ», якія завіталі ў госці да дзяцей, тут зроблена значна больш, чым бывае ў некаторых звычайных сем'ях.

Ну ў якім прыватным доме ці кватэры можна сустрэць, напрыклад, хатнюю царкву? А тут яна ёсць. У царкве рэгулярна праводзяцца абрады, прычасці, хрэсьбіны, дзеці займаюцца ў нядзельнай школе. На традыцыі выпускнікоў бласлаўляе святар — ён завітвае і на Вялікдзень, і на пачатак навучальнага года, і да Дня абароны дзяцей, і на Каляды.

На другім паверсе створаны этнаграфічны куточак — зона, афармленая як сялянская хата. Тут жа ёсць і прастора, убраная ў стылі савецкіх часоў. Тут жа знаходзяцца экспазіцыі з выстаўкамі твораў дзяцей. Сваімі рукамі яны робяць выцінанкі, вяжуць, малююць, шыюць... Кірункаў творчасці не пералічыць. У гэтым міні-музеі бібліятэкар праводзіць з дзецьмі занятк і па вывучэнні гісторыі краю. Так, у доме ёсць нават свая невялічкая бібліятэка. Побач — басейн з саўнай. У басейн летам можна прыбягаць акунацца адразу з вуліцы. А ва ўласным фізіяпрацэдурным кабінеце медсястра, якая знаходзіцца тут кругласутачна, адказвае за ўсе віды прафілактычнага лячэння, а калі трэба — робіць масаж і гідрамасаж.

Мастацкая і танцавальна-харэаграфічная студыі для развіцця творчасці, трэнажорная і спартыўная залы для ўмацавання здароўя, падлеткавы клуб, дзе праходзяць дыскатэкі, і нават більярдны стол — ні адзін метр прасторы дома не «прастойвае». А на вуліцы — яшчэ і комплекс з антывандальнымі трэнажорамі. На ўвесь Мазыр такіх толькі чатыры: адзін у дзіцячым доме і тры ў горадзе.

### РУЙНАВАЛІ І БУДАВАЛІ

Дзякуючы ўпартасці і імпэту **дырэктара Мазырскага дзіцячага дома Ірыны ВІШНЕЎСКАЙ,** якая прыйшла сюды амаль 16 гадоў таму, установа натуральна перарадзілася. Пачыналі з рамонту, бо будынку на той момант было больш за 20 гадоў.

— Калі ўбачыла гэты дом, адразу вырашыла: вось месца для здзяйснення маёй мары — каб дзеці жылі інакш. У той час гэта быў дашкольны дзіцячы дом саюзнага значэння для глухіх, з дрэнным слыхам і іншых дзетак. Іх было 109. Цяпер малых у нас значна менш, і мы іх нікуды не аддаём, акрамя як на ўсынаўленне. Сёлета вось шасцярых усынавілі, — радуецца Ірына Іванаўна.



Натхнёнасць дырэктара супала з дзяржаўнай палітыкай рашучых крокаў ад інтэрнатаў у бок сямейнага ўладкавання, а актыўнасць — зацікавіла неабыякавых людзей. Дому падарылі праект перабудовы, дапамаглі прайсці экспертызу (па тых часах гэта каштавала 40 мільёнаў).

— Мы спачатку руйнавалі дзіцячы дом, а пасля будавалі нанова, — кажа дырэктар. — Замянілі сістэмы ацяплення і водазабеспячэння, зрабілі дах, адрамантавалі гульнявыя веранды, дабудавалі басейн. На лета, пакуль ішоў рамонт, дзяцей прыстройвалі на патранатнае выхаванне ў сем'і.

### МЫ ВАМ ДАПАМОЖАМ!

Намаганнямі дырэктара знайшліся і замежныя спонсары. Італьянцы зацікавіліся яе праектамі-задумкамі і дапамаглі зрабіць у доме першую кватэру.

— Яны хацелі пабачыць, як мы рэалізуем выдаткаваныя сродкі. Першую кватэру мы адкрылі ў 2012 годзе, — успамінае Ірына Вішнеўская. — Цяпер іх у нас чатыры, у планах зрабіць пятую.

Дзеці наведваюць звычайныя садкі і школы, гарадскія гурткі і секцыі, часта ездзяць на экскурсіі.

— Усю рэспубліку аб'ездзілі з імі. Ды і да нас госці часта прыязджаюць. Мы ўдзельнічаем ва ўсемагчымых конкурсах, і перамагаем таксама, — расказвае дырэктар. — Самі асвоілі гітару, займаемся вакалам, малюем. У нас адзін з найлепшых сайтаў — там усе свае навінкі вывешваем, расказваем, што ў нас адбываецца, каб людзі ведалі нашых дзетак, іх характары, адметнасці.

Дзеці самі ходзяць у краму і клапоцяцца пра хатніх жывёл: кошку Багіру і сабаку Фрэдзі. А на кухні асвойваюць кулінарную навуку.

— Дзеці тут самі могуць падагрэць ежу, калі затрымаліся на занятках, ці нешта прыгатаваць, а на дні нараджэння нават тарты пякуць. Усё, як у звычайных «бацькоўскіх» малых, — кажа **Галіна ВАСІЛЕНКА, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце** *(на фота)*. — Усе гэтыя кантакты з бытавой тэхнікай — жывая і непасрэдная падрыхтоўка да дарослага жыцця. Нашы выпускнікі могуць і закаткі закруціць, і аладкі падсмажыць, і суп прыгатаваць, і нават варэнне з кабачкоў, што на градах вырасцілі, зварыць. А з дзве тоны яблык, што мы на восені збіраем у нашым садзе — там 180 фруктовых дрэў — і на варэнне ідуць, і на сушку, і на сок.

На градах і ў цяпліцы, дарэчы, шчыруюць і дзеці, і выхавацелі. А яшчэ трэба даглядаць 80 кустоў вінаграду, парэчкі...

— Калі дзеці кажуць нам: «Зараз мы вам дапаможам», я заўжды гавару: «Не, даражэнькія, гэта мы вам дапаможам, бо гэта мы прыйшлі да вас дадому. Гэта вы тут жывяце», — усміхаецца дырэктар. — Хочаце агарод і парнік? Вось вам расада — рабіце. Гэта ўсё ваша.

За вокнамі бачым белы сад. Усе кветкі тут — флёксы, ліліі, званочкі — белыя. Над упрыгожваннем тэрыторыі старанна думаюць і па меры сіл выконваюць. Цяпер займаюцца добраўпарадкаваннем двара, каб дом быў яшчэ больш утульны і выглядаў па-хатняму. Кажуць, ізноў неабходна спонсарская дапамога, бо вельмі мараць малыя пра сучасную спартыўную пляцоўку.

### «КНІГА ЖЫЦЦЯ» І ПАЎМЕХА БУЛЬБЫ

Педагогі знаходзяцца ў доме з сямі раніцы да дзесяці вечара. Пасля з выхаванцамі застаюцца памочнікі выхавацеляў. Хоць часта і самі выхавацелі начуюць на рабоце, а на выхадныя, здараецца, афармляюць малых на патранатнае выхаванне і забіраюць да сябе дадому.

Дома застаём Насцю. Сёлета яна скончыла політэхнічны каледж і едзе ў Светлагорск па размеркаванні працаваць страхавым агентам. Там ёй дадуць кватэру, а пакуль яна праходзіць практыку.

— Страшна крыху, што буду самастойна жыць. Прывыкла ўжо да дзіцячага дома, люблю яго, я тут з 11 гадоў. Ірына Іванаўна мяне выгадавала. І развітвацца не хочацца. Але я буду абавязкова прыязджаць.

— Яна ў нас малайчына, — кажа дырэктар, абдымаючы Насцю. — Я перад тваім ад'ездам абавязкова падару табе пазногці з гель-лаку, каб была прыгожай.

Для кожнага выпускніка выхавацелі рыхтуюць «кнігу жыцця». Гэта саматробны альбом з фотаздымкамі, па якім можна прасачыць, чым займаўся гадаванец дома, што яго цікавіла, як ён бавіў час, з кім сябраваў.



— Здымаем часта, нават калі дзеці не бачаць. Пасля яны здзіўляюцца — адкуль у нас гэта ўсё? — смяецца намеснік дырэктара. — Да кожнага альбома прыкладаем яшчэ дыск з відэазапісам. Знаходзім спонсараў, каб тыя дапамаглі дзецям самым неабходным: пасцельнай бялізнай, талеркамі, чайнікам якім... А яшчэ ўсім даём з сабой па паўмеха бульбы ды розную кансервацыю.

Так і жывуць-гадуюцца...

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота Андрэя САЗОНАВА.**

# САМАЕ БЯСПЕЧНАЕ МЕСЦА

## ЗНАЙДЗІЦЕ ПЛЮСЫ Ў ШКОЛЬНЫМ ЖЫЦЦІ

— Некаторыя з бацькоў разважаюць прыкладна так: калі дзіцяці споўнілася шэсць гадоў, яно ўмее чытаць і пісаць, значыць, яго трэба аддаваць у школу. Але ўменне гэта рабіць зусім не азначае гатоўнасць да школы, — папярэджвае спецыяліст. — Для першакласніка куды больш важна ўмець граматна пераказваць тэкст, абагульняць, параўноўваць і лагічна разважаць. На маю думку, шасцігодкі належаць больш усё ж такі дашкольнаму свету, чым школе: сапраўды, яны здольныя засвойваць вучэбны матэрыял, але толькі ў выглядзе гульні.

Трэба ведаць, што **гатоўнасць да школы — гэта складаны комплекс пэўных псіхафізіялагічных станаў, уменняў і навыкаў.** Здароўе будучага першакласніка — адзін з галоўных фактараў, які ўплывае не толькі на працягласць і паспяховасць адаптацыі да школы, але і на ўсё далейшае навучанне. Калі дзіця часта і доўга хварэе, то лепш адкласці знаёмства са школай.

**«Ёсць маленькія «прафесары», якія ўсё ведаюць і ўсё ўмеюць, вось толькі не ўмеюць узаемадзейнічаць ні з дарослымі (акрамя членаў сваёй сям'і), ні з іншымі дзецьмі».**

У вялікай ступені здольнасць да навучання залежыць ад генетычнай спадчыннасці, але не менш могуць паўплываць і характар працякання цяжарнасці, заўчасныя роды. За шэсць гадоў усё быццам бы забылася, але насамрэч гэтыя фактары сур'ёзна ўздзейнічаюць на далейшае развіццё немаўляці, у такіх дзяцей зніжаны адаптацыйны рэсурс. А навучанне ў школе — гэта сур'ёзная нагрузка. Таму фізіялагічную сталасць ні ў якім разе нельга скідваць з рахунку.

Абавязкова трэба звяртаць увагу на сацыяльную гатоўнасць дзіцяці да навучання — пад ёй трэба разумець патрэбу малога ў зносінах з іншымі, настрой на працу і супрацоўніцтва і пэўную самастойнасць (эмацыянальную і псіхалагічную сталасць). Ёсць маленькія «прафесары», якія ўсё ведаюць і ўсё ўмеюць, вось толькі не ўмеюць узаемадзейнічаць ні з дарослымі (акрамя членаў сваёй сям'і), ні з іншымі дзецьмі.

Гатоўнасць да школы — гэта яшчэ і наяўнасць матывацыйнай гатоўнасці, прычым малога павінен вабіць не проста вонкавы бок школьнага жыцця (навенькія ранец, падручнікі, сшыткі), а магчымасць атрымліваць новыя веды.

— Важна, што мы як бацькі транслюем сваім дзецям, калі яны ідуць у першы клас, — падкрэслівае Вольга Бык. — Калі ў нас быў негатыўны вопыт і мы самі баімся школы, то несвядома будзем перадаваць сваю трывогу дзіцяці. Хаваць хваляванне — пазіцыя памылковая. Колькі б матуля ні ўсміхалася, ні падбадзёрвала сябе, дзіця гэта адчуе. Таму раю пакапацца ў мінулым, разабрацца са сваімі страхамі і знайсці плюсы ў школьным жыцці. Можна паказаць школьныя фатаграфіі, прыгадаць цікавыя гісторыі, расказаць пра настаўнікаў, якія адыгралі для вас важную ролю.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Трэба патлумачыць дзіцяці сэнс школы. Ты вучышся не для бацькоў, а для сябе, каб даведвацца штосьці новае, знайсці сваю любімую справу. Першы год навучання — пераломны перыяд у жыцці дзіцяці. Змяняецца яго сацыяльны статус, узрастае псіхаэмацыянальная нагрузка, яно спасцігае сябе ў новай сістэме грамадскіх адносін. Дзіця ідзе ў школу, дзе яму давядзецца наладжваць узаемаадносіны з аднакласнікамі і настаўнікам, таму ўменне прыслухоўвацца да іншых, саступаць і абараняцца будзе для яго зусім не лішнім, як і ўменне прытрымлівацца пэўных правілаў — гэтаму можна навучыць праз гульню. Таксама трэба прывучыць дзіця любую распачатую ім справу даводзіць да канца.

## НЕ АДБІРАЙЦЕ ЦАЦКІ!

— Адаптацыя да школы — гэта працяглы працэс. Малым давядзецца прыстасоўвацца да новай абстаноўкі, працоўнага рэжыму, калектыву і новых сяброў. Школа літаральна з першых дзён ставіць перад вучнем цэлы шэраг задач, не звязаных з яго папярэднім вопытам, патрабуе максімальнай мабілізацыі інтэлектуальных, эмацыянальных і фізічных рэсурсаў, — расказвае Вольга Бык. — Адаптацыя можа займаць ад некалькіх тыдняў да паўгода: усё залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў дзіцяці, яго таварыскасці, адукацыйных нагрузак і ступені падрыхтаванасці дзіцяці да школьнага жыцця. Дзяўчаты, як правіла, адаптуюцца хутчэй за хлопчыкаў, бо яны больш камунікабельныя.

Найбольш складаныя — першы—чацвёрты тыдзень з пачатку заняткаў. Менавіта ў гэты перыяд у найбольшай ступені праяўляецца напружанне ўсіх функцыянальных сістэм арганізма дзіцяці, звязанае са змяненнем звычайнага ладу жыцця. На што бацькам трэба звяртаць увагу? На змяненні ў паводзінах, зніжэнне моўнай актыўнасці, страту апетыту, парушэнні сну, няўстойлівы эмацыянальны стан. Калі на працягу двух-трох тыдняў стан дзіцяці ўваходзіць у норму — значыць, адаптацыя праходзіць без праблем, а калі парушэнні сталі больш працяглымі і выразнымі, дзіця пачало скардзіцца на боль у жываце, у яго павысілася тэмпература цела — арганізм падае сігнал трывогі. Вельмі інфарматыўныя для бацькоў могуць быць малюнкі, з іх можна даведацца, як дзіця ўспрымае школу, новых сяброў і сваё месца ў школьным свеце.

Першакласніку давядзецца самому сябе абслугоўваць, таму вельмі важна, каб дзіця да моманту паступлення ў школу мела пэўную долю самастойнасці: умела завязваць шнуркі, зашпільваць гузікі, трымаць у парадку свой



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

пакой, месца для заняткаў, цацкі, адзенне, абутак. Не варта рабіць за дзяцей тое, што яны ў стане зрабіць самі. Той жа партфель па першым часе можна збіраць разам з сынам ці дачкой, але паступова перадаваць гэту функцыю малому. Вялікая памылка — адбіраць у дзіцяці цацкі і казаць: «Ты ўжо дарослы...» Гульнявая дзейнасць будзе прысутнічаць усю пачатковую школу.

Для таго каб малы прасцей прызвычаіўся да новых умоў жыцця і вучоба не здавалася яму цяжкім абавязкам, неабходна прывучыць яго выконваць распарадак дня. Гэта будзе спрыяць развіццю арганізаванасці, што дапаможа прасцей спраўляцца з вучэбнымі нагрузкамі. «А вось рэзка змяняць распарадак дня катэгарычна нельга — мы рызыкуем выклікаць у дзіцяці супраціўленне», — папярэджвае спецыяліст.

## НЕ КРЫТЫКУЙЦЕ І НЕ АЦЭНЬВАЙЦЕ

— Школа — не камера захоўвання, куды бацькі здаюць сваіх дзяцей. Больш за ўсё на свеце ў першы год вучобы малым патрабуецца бацькоўская падтрымка, — падкрэслівае Вольга Бык. — Задача дарослых — актыўнае слуханне, бо першакласніку патрэбна эмацыянальная разрадка і спачуванне. У зносінах з дзецьмі важныя павага і ўвага. Калі дзіця трапляе ў новае асяроддзе, дзе ўстаноўлены свае правілы і абмежаванні, абвастраецца страх памылкі, страх быць дрэнным у вачах дарослых. Трэба патлумачыць, што памылкі робяць усе, можна прывесці прыклады з уласнага мінулага...

А вось калі бацькі выхоўваюць «чэмпіёна», прад'яўляюць да дзіцяці вельмі строгія патрабаванні — гэта сапраўдная бяда, — заўважае псіхолаг.

— Калі яны кажуць пастаянна: «Ты павінен добра вучыцца, добра сябе паводзіць...» — у малога ўзнікае страх. А калі я не буду добра вучыцца, мяне не будуць любіць? У такім выпадку школа можа разглядацца ім ужо як вораг, які можа пазбавіць бацькоўскай любові. У дзіцяці можа нават развіцца неўроз. Ні ў якім разе нельга дапусціць у доме культу адзнак. Мы павінны любіць дзіця такім, якое яно ёсць, не крытыкаваць, не параўноўваць яго з іншымі, а звяртаць увагу толькі на яго асабісты прагрэс: што ў яго атрымалася лепш, чым учора ці пазаўчора.

**Сям'я — гэта безумоўная любоў. Ацэньвае знешні свет, а бацькі не павінны ацэньваць. У першым класе дзеці любую крытыку ўспрымаюць не як крытыку свайго ўчынку, а як крытыку сваёй асобы, таму трэба быць вельмі асцярожнымі са словамі.**

Забудзьцеся пра фразы кшталту «Што ты сёння атрымаў?» ці «Якія поспехі ў школе?» Лепш запытайцеся ў малога, што было на ўроках цікавага, чаму ён навучыўся, з кім пазнаёміўся, чым займаўся з новымі сябрамі, як прайшоў яго дзень. Самае галоўнае заахвочванне — гэта словы. Трэба як мага часцей казаць дзецям: «Ты мой герой!», «Я ў цябе веру», «Ты справішся», «Я табой ганаруся», «Ты мяне радуеш...»

Яшчэ адна важная ўмова паспяховай адаптацыі — узаемадзеянне бацькоў з педагогам. Трэба абавязкова знайсці з ім агульную мову, а для гэтага варта часцей заходзіць у школу. Увогуле ролю першага настаўніка ў жыцці дзіцяці складана пераацаніць. Менавіта ён стварае ў класе атмасферу, у якой дзеці будуць адчуваць сябе камфортна ці наадварот. Добра, калі на першым плане знаходзіцца гульнявая дзейнасць, якая дазваляе прасцей уліцца ў навучальны працэс. Калі першакласніку падабаецца педагог, яму будзе цікава ўсё, што той транслюе, а ў процілеглым выпадку дзіця закрыецца і не возьме ад настаўніка інфармацыю, якую той спрабуе данесці. Таму да выбару першага настаўніка бацькам трэба падысці вельмі адказна.

Для дзяцей у малодшых класах надзвычай важны тактыльны кантакт: калі першакласнік можа свабодна падысці да педагога, абняць яго, падзяліцца чымсьці для сябе вельмі важным, значыць, адаптацыя праходзіць паспяхова.

## НЕ ПАДМЯНЯЙЦЕ КНІГУ ТЭЛЕВІЗАРАМ

Чым яшчэ могуць дапамагчы бацькі свайму першакласніку?

**Вялікае значэнне мае мікраклімат у сям'і.** У выпадку ўзнікнення складанай ці канфліктнай сітуацыі ў школе дарослыя могуць выказваць свой погляд на праблему, але дзіця павінна адчуваць іх падтрымку. Яму трэба быць упэўненым у тым, што сям'я — гэта зона бяспекі, дзе яго заўсёды пачуюць і дапамогуць. Дарослым трэба стрымліваць свае эмоцыі, калі празмерна ўзбуджаны першакласнік скардзіцца, што яго пакрыўдзілі, штосьці ў яго аднялі, не далі і гэтак далей. Трэба спакойна высветліць, што здарылася, а не агучваць услых паспешлівыя высновы...

**Уласны прыклад — таксама добры матыватар для дзіцяці.** Калі бацькі самі любяць вучыцца, чытаць, даведвацца пра штосьці новае, гэта будзе перадавацца і дзецям. І навучанне ў школе стане ўспрымацца як цалкам натуральны працэс. Можна закласці сямейныя традыцыі, звязаныя з 1 верасня. Акрамя ўрачыстай лінейкі ў жыцці малога абавязкова павінна быць штосьці яшчэ.

**Чытайце дзецям кнігі.** Ні ў якім разе нельга падмяняць чытанне тэлевізарам. Пра гэта бацькам трэба памятаць заўсёды. Заахвочвайце ўсе заняткі, якія развіваюць фантазію і кемлівасць: маляванне, лепку, канструяванне.

**Падтрымайце ў дзіцяці яго імкненне стаць школьнікам.** Ваша шчырая зацікаўленасць у яго школьных справах і клопатах, сур'ёзнае стаўленне да першых дасягненняў і цяжкасцяў дапамогуць першакласніку пацвердзіць значнасць яго новага статусу. Падзяляйце з ім усе маленькія радасці, пастаўце работы, зробленыя яго рукамі, на прыметнае месца. Пахваліцеся поспехамі малога перад бабуляй і дзядулем. Дайце яму адчуць сябе паспяховым і шчаслівым чалавекам! Верце ў сваё дзіця! Для яго гэта галоўнае благаслаўленне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ДЗЯЎЧЫНКА І КРАКАДЗІЛ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

***— Павел, прызнайцеся: сюжэты для кніг «Дзяўчынка і кракадзіл» і «Тата, раскажы пра мяне гісторыю» ўзятыя з рэальнага жыцця вашай сям'і?***

— Канешне, і кракадзіл сапраўды жыве пад ложкам і есць як не ў сябе! Жартую. Але ўсе гісторыі мне падказвала дачка. Адкуль узяўся кракадзіл? Давялося яго прыдумаць, каб дапамагчы Соні перамагчы страх цемры. Яна баялася, што ноччу з-пад ложка выпаўзуць павукі — страшныя, з касматымі лапкамі, — таму патрэбен быў хтосьці, хто б мог іх адолець. Нам здалося, што маленькі хатні «падложкавы» кракадзіл — ідэальная кандыдатура для гэтай справы. Праўда, яго ролю адыгрывае зялёны плюшавы бегемот... З невялікай часткі гісторый пра сяброўства Соні і кракадзіла і атрымалася кніга. У другім зборніку мы абышліся без гэтага персанажа. Ён сваю функцыю ўжо выканаў, можа ісці адпачываць.

***— Соня баялася цемры, нехта баіцца ўколаў, нехта — адзіноты... Што могуць зрабіць бацькі, каб дапамагчы дзецям справіцца з гэтымі страхамі?***

— Па-першае, трэба знайсці прычыну. Гэта ж не проста «я баюся». Што мяне палохае? Монстр, які жыве ў цемры? Ці тое, што там пустэча нейкая? Чаму я баюся ўколаў? Таму, што мяне пужае боль, ці таму, што цётка ў белым халаце надта падобная да нейкай здані з фільмаў жахаў? Гэта ж розныя рэчы. Соня баялася, што ў цемры хаваюцца павукі. Адпаведна, я прыдумаў героя, які абараняе яе ад гэтых павукоў. Калі б яна перажывала, што там пустэча і цемра, я напоўніў бы гэту цемру чым-небудзь. Тымі ж павукамі. Ці прывідамі, напрыклад. Спачатку высветліце прычыну, якая выклікала страх, і змагайцеся менавіта з ёй.

***— З дапамогай прывідаў?!***

— Ну, абыгрыйце сітуацыю, перавядзіце ўсё ў гульню. Дзеці гадоў да 8-9 вельмі вядуцца на такія штукі, іх лёгка зацікавіць, «пераключыць». Я не кажу, што гэта ўніверсальны спосаб: малыя розныя бываюць, у кагосьці, напрыклад, няўстойлівая псіхіка — тут патрэбныя іншыя метады. Але ў маім выпадку ўсё атрымалася, за 2-3 месяцы страх зусім знік, быццам яго і не было. Калі цяпер мая паненка і баіцца чаго-небудзь, дык хіба што накаўта на рынгу (дачка Паўла займаецца боксам і дзюдо. — **Аўт.**).

***— Калі меркаваць па кнігах, Соня — даволі капрызлівая дзяўчынка, з характарам: то ў школу ісці не хоча, то кашу есці адмаўляецца, то хлопчыка надакучлівага паб'е... Як бацькам знайсці агульную мову з такім неспакойным дзіцем?***



**У адпачынак — заўсёды ўсёй сям'ёй.**




**«Амаль такі жыве ў мяне пад ложкам!»**

— Любіць яго. Я, напрыклад, люблю сваю капрызлівую, непаслухмяную дзяўчынку! Я прымаю яе такой, якая яна ёсць. Чуў такое выказванне: як бы вы добра ні ставіліся да дзіцяці, у дарослым узросце яму заўсёды будзе што расказаць на прыёме ў псіхолага. Таму не трэба заганяцца, не трэба неяк вельмі складана да выхавання падыходзіць. Проста прымайце ўдзел у жыцці сына ці дачкі. Станьце яму неабходным чалавекам, партнёрам, дарадцам. Я вельмі часта назіраю сітуацыі, калі бацькам дзеці быццам і не патрэбныя — прывядуць іх некуды, у пясочніцу ці ў забаўляльны цэнтр, і займаюцца сваімі справамі. А дзіця ж усё адчувае... Сонька прыбягае да мяне і кажа: «Тата, вось там вось гэта вось так, патлумач мне!» Я, канешне, думаю: «А ё-маё...» А ўслых кажу: «Добра, падыдзі, калі ласка, праз некалькі хвілін». І хуценька ў «гугл» лезу. Нават не трэба ісці ў бібліятэку і падымаць гару літаратуры. Адказалі на пытанне, растлумачылі ў агульных рысах, не пакінулі без увагі — і ўсё, вы аўтарытэт.

Праявіце шчырую цікавасць да інтарэсаў дзіцяці. Дачцы падабаецца рабіць караблікі з паперы? І вы навучыцеся! Сын захапіўся дыназаўрамі? Вазьміце кніжку па палеанталогіі, праштудзіруйце. Вас бесіць тое, чым дзіця займаецца? Змірыцеся. Не спрабуйце перанакіраваць яго на тое, што вам здаецца больш прыдатным. Калі я прыводзіў Соню на трэніроўкі, то бачыў хлопчыкаў, якія стаялі там і румзалі. А ўсё таму, што тата сказаў: «Мужык павінен прыйсці і займацца боксам!» А малы стаіць і плача. Можа, ён маляваць хоча. Навошта ламаць псіхіку дзіцяці?

Калі Соф'і было 5 гадоў, мы хацелі аддаць яе на танцы. Але яна катэгарычна сказала: «Я не буду сюды хадзіць». Нехта б, напэўна, праявіў цвёрдую бацькоўскую пазіцыю, пачаў «цягаць» малое туды: «Я ж на цябе час трачу!» Але калі я разумею, што мая дачка няшчасная... Дзіця праявіла сваю волю. Варта прыслухацца да гэтага «я не хачу сюды, мне тут дрэнна» і пайсці насустрач. «А што хочаш?» — «Хачу на дзюдо!» Ну і добра. А хадзіла б цяпер на танцы — пакутавалі б усе...

***— Але ці можна ўсё дазваляць дзецям і заўсёды патураць іх капрызам?***

— Тут трэба ўбачыць тонкую мяжу паміж «я хачу» і «я закатваю істэрыку». Вопытным шляхам. Гэта вельмі складана, і я не кажу, што сам умею гэта рабіць. Вось літаральна ўчора ўвечары мы глядзелі кіно, я такі: «Соня, на сёння хопіць, выключай камп'ютар!» А яна адказвае: «Не буду!» — «Чаму?» — «Не хачу!» І вось што гэта — капрыз? Ці я зайшоў на яе тэрыторыю? Канфлікт атрымаўся на роўным месцы, і я — прызнаюся шчыра — не змог граматна выйсці з яго. Потым сядзеў і думаў, як трэба было сябе паводзіць: напэўна, паспрабаваць неяк абыграць сітуацыю. Але я прыехаў з камандзіроўкі, стаміўся... У мяне не было на гэта сіл!

Увогуле, часцей за ўсё канфлікт узнікае ад таго, што тата або мама стаміліся. Ты прыйшоў з работы ніякі: замучыўся, пакуль план перавыконваў. А навошта той план? Начальнік табе, што, даражэйшы за дзіця? Атрымліваецца, што чужыя дзядзькі з зашмальцаванымі паперкамі важнейшыя за самага галоўнага чалавека ў тваім жыцці. Што за бязглуздзіца? Начальніку, канешне, гэта не растлумачыш, але трэба неяк навучыцца лавіраваць.

Найлепшы падарунак малому — увага дарослага. Вы самі потым будзеце перажываць з-за нейкіх страчаных магчымасцяў. Вось я шмат часу з Соняй праводжу, але ўсё роўна вельмі шкадую пра тыя моманты, калі быў не з ёй. Не разумею, як людзі ў адпачынак ездзяць без дзяцей. «Я хачу адпачыць ад яго». Як? Вы пра што? Не, я не вар'ят, які ўсюды бегае за сваім дзіцём. Але што ў вашым жыцці будзе цікавейшае за вашу дачку ці сына? Яны вырастуць — і ўсё, нават падлетку вы ўжо не патрэбныя будзеце. У вас ёсць 10, 11, 12 гадоў, якія можна правесці шчасліва для сябе. А потым — хіба што ўнукаў чакаць. На пенсіі вы будзеце ўспамінаць не пра тое, як план па продажах выконвалі ці машыну новую куплялі. Вы будзеце згадваць, як разам мячык у пясочніцы штурхалі і замак з пяску будавалі. Я ўжо цяпер толькі такія моманты і памятаю.

***— Ёсць такая філасофія выхавання ў японцаў: да 5 гадоў ставіцца да дзіцяці як да бога, да 15 — як да раба, а пасля 15 — як да сябра. Я так разумею, ваша «тактыка» — заўсёды быць дзіцяці сябрам?***

— От ужо гэтыя японцы... Ведаеце, мы з жонкай разышліся ў гэтым пытанні. Не наконт японцаў — наконт ролі бацькоў. У нашай сям'і тата — сябар. Мама ж катэгарычна супраць, яна лічыць, што тата павінен быць «уладай». Гэта значыць — прымушаць нешта зрабіць. У нашым доме ўсё наадварот: мама — больш жорсткі чалавек, а тата... Дайце падбяру літаратурнае слова... Памяркоўны! У таты не атрымліваецца прымусіць, у таты атрымліваецца ўгаварыць. Я сябар. Прычым часам нават малодшы сябар. Такі ў мяне стыль паводзін з дзецьмі.



**Павел разам з дачкой на прэзентацыі сваёй кнігі.**

Можа быць, гэта не зусім правільна — бацька павінен быць нейкім аўтарытэтам. Але лепш за ўсё — старэйшым таварышам, які дапамагае дзіцяці прымаць рашэнні. А калі малое яшчэ зусім маленькае — дае гэта рашэнне і стварае бачнасць таго, што дзіця прыняло яго самастойна. Вось гэта, пэўна, самы ідэальны варыянт — нейкім чынам накіраваць і падказаць. Таму што калі дзіця ў пяць-шэсць гадоў стане раўнацэнным партнёрам у сям'і, у яго адбудзецца істэрыка. Не можа быць такога, што тата, мама і малы сядаюць вечарам утраіх за стол, і тата сур'ёзна кажа: «Так, ну што, у якія акцыі будзем укладваць грошы? Падумай, сынок, бо калі не атрымаем даход, здадзім цябе ў дзіцячы дом!» Дзіця хай прымае рашэнні ў дробязях, а з нечым больш значным яму дапамогуць бацькі.

**«Да вас прыходзяць, прыносяць аркушык, кажуць: «Глядзі, тата, што я намаляваў!» А тата, засяроджана ўтаропіўшыся ў экран, мычыць: «Угу».**

Але самае галоўнае і для мамы, і для таты, як я ўжо казаў, — праяўляць шчырую зацікаўленасць у жыцці дзіцяці. І, калі ласка,не адгароджвайцеся тэлефонам ці планшэтам. Да вас прыходзяць, прыносяць аркушык, кажуць: «Глядзі, тата, што я намаляваў!» А тата, засяроджана ўтаропіўшыся ў экран, мычыць: «Угу». А вы ўважліва паглядзіце на малюнак, ацаніце старанні. І няхай там нешта незразумелае, крывенькае, крыху сюррэалістычнае. «О, ты, напэўна, Сальвадор Далі!» — «А хто такі Сальвадор Далі?» — «А я табе зараз раскажу». Маленькаму чалавеку, які да вас звярнуўся, на гэты момант сапраўды важна пачуць ваша меркаванне. Вы ж сваім стаўленнем рыхтуеце падлетка, які альбо вырасце ворагам бацькам (а з падлеткамі і так складана), альбо захоча да іх прыслухоўвацца. Няхай і на 10 працэнтаў. Я спадзяюся, што Соня ў 14—15 гадоў будзе хоць трошкі дзяліцца нейкімі момантамі са свайго жыцця і прыслухоўвацца да таты. Я шчыра на гэта спадзяюся.

**Алена КАРПЕНКА.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА і з сямейнага архіва.**

Бліжэй да прыроды

# ТЭРЫТОРЫЯ ДЛЯ ДУШЫ

**Вядомая беларуская пісьменніца, аўтар бестсэлераў «Площадь согласия», «Территория души» і «Миг бесконечности», а таксама некалькіх зборнікаў вершаў Наталля БАТРАКОВА ўжо на працягу 16 гадоў жыве ў знакамітым аграгарадку Ратамка. «Жывём, нібыта ў батанічным садзе. А якая тут раскоша для ўнукаў і нашых кошкі ды сабакі!» — кажа пісьменніца. Я чамусьці ўяўляла модны дызайн участка, дзе ўсё нібыта са старонкі глянцавага часопіса. А ўбачыла мора руж, утульнасць і такую добрую патрыярхальнасць.**



— І я, і мой муж выраслі ў прыватным сектары. Потым жылі ў гарадской кватэры, і я думала, што так будзе заўсёды. Але неяк муж сказаў, што хоча будаваць дом за горадам. Не лецішча, а менавіта дом для ўсёй сям'і. Ведаеце, я цяпер разумею, што гэта не была даніна модзе — маўляў, дасягнуўшы пэўнага матэрыяльнага становішча, па статусе трэба мець загарадны дом. Не, гэта было іншае — патрэба быць бліжэй да прыроды, да сваіх каранёў, — апавядае Наталля.

**— А вы, як дзекабрысткa, паехалі за мужам ці жылі на два дамы?**

— Роўна месяц я пражыла на два дамы і зразумела, што мне гэта цяжка, ды і няправільна ў дачыненні да сваёй сям'і. Пераехала ў Ратамку і ніводнага разу не пашкадавала аб гэтым. Больш за тое — цяпер ужо не ўяўляю, як людзі жывуць у горадзе. Неяк засталася начаваць у сяброўкі, дык не магла заснуць: то ліфт гудзіць, то яшчэ які грукат. Зразумела, што і дыхаецца ў мегаполісе не так лёгка, як у нас на прыродзе. Гэта такое шчасце — раніцай басанож прайсціся па расе! А як цудоўна амаль круглы год жыць сярод кветак! У нас жа тут першыя зацвітаюць пралескі і крокусы. З цягам часу я навучылася рабіць так, каб на клумбах не было «лысін»: кветкі цвітуць адны за другімі. А завяршаюць сезон хрызантэмы і позняя ружы. Апошні букет я зразаю ў лістападзе і сама сабе раблю такі падарунак.

**— Наталля, у вас вялікі ўчастак, шыкоўныя ружы, ставок і нават цяпліцу будуеце. Скажыце шчыра, колькі ў вас памочнікаў?**

— Сапраўды, ёсць дзяўчына, якая дапамагае ў маім міні-батанічным садзе. Але мы шмат што робім разам. Канешне, усё гэта патрабуе і часу, і намаганняў, але калі ты любіш свой лапік зямлі, сваю ружавую алею, то даглядаць гэта ўжо не цяжкая праца, а задавальненне. Да жадання паставіць цяпліцу трэба было дарасці, я шмат чытала пра тое, як ёй карыстацца. Трэба было даць сабе шчыры адказ на пытанне, ці хопіць у мяне на гэта часу і жадання. У нас, як бачыце, няма вялікага агарода, але дзве-тры градкі з зяленінай, агуркамі, рукалай робім. Цяпер вось і цяпліца з тамататамі ды іншай гароднінай дадасца.



Нашы ўнукі выраслі тут. Я нават іншым разам думаю, што для іх дзед, бабуля і Ратамка — сінонімы. Для дзяцей асалода — садавіна ды ягады. Вельмі любім ліпень, бо выйдзеш у сад, а там — маліны, чарэшні, парэчкі, агрэст... Смаката! Сваё, здаецца мне, смачнейшае за купленае на Камароўцы.

**— Відаць, што ружы — ваша захапленне. Як доўга збіралі такую калекцыю?**

— Нават калі ў нас не было гэтага дома, недзе ў глыбіні душы ў мяне жыла мара пра ружавую алею. Калі будаваўся дом, пачала яе ажыццяўляць. Тады яшчэ не было садовых цэнтраў і вялікага выбару кветак, у прыватнасці руж. Але я шукала, нешта замаўляла праз інтэрнэт, набывала за мяжой, штосьці прывозілі сябры. Адны з першых у маёй калекцыі — чайныя ружы, якія мне прывезлі з Узбекістана. Вельмі далікатныя кветкі, з тых дзевяці кустоў і цяпер тры цвітуць. На першым часе я займалася і вырошчваннем расады, але хутка зразумела, што прасцей купіць на рынку. А цяпер і ўвогуле шмат розных садовых цэнтраў, гадавальнікаў. На маю думку, у нас прадаюць і расаду, і саджанцы добрай якасці, і выбар ёсць на любы густ і кашалёк.

**— Як вам тут жывецца ўзімку?**

— Цудоўна! Цёпла і ўтульна. А яшчэ не трэба марнаваць грошы на заняткі фітнесам. Расчысціў сцежкі ад снегу — вось вам і фітнес. У горадзе людзі снегу звычайна не рады, а мы яго вельмі чакаем. Любіць зіму і наш сабака Тэдзі. Яшчэ ў нас тут пачуваецца гаспадыняй кошка Рыся. Яна жыла ў сям'і дачкі, але ім даволі часта даводзіцца ездзіць у камандзіроўкі, таму Рысю аддалі нам. Яна вельмі любіць гасцей, але калі прыязджае дачка, то хаваецца — баіцца, што забяруць у горад.

**— Цяпер часцей людзі сустракаюцца ў кафэ, а жыллё становіцца такім прыватным месцам, куды нікога не запрашаюць. Дзверы вашага дома адчынены для сяброў?**

— Безумоўна! Мы рады нашым сябрам. Нават калі рабілі рамонт, то часткова перапланавалі ўчастак, каб была паркоўка для гасцей. Сустрэчы ў кавярнях маюць права на жыццё, але ж дома — зусім іншая рэч, тут цёплая, нязмушаная атмасфера.

Дарэчы, калі мы толькі перасяліліся сюды, то нашы сябры глядзелі на нас крышку са здзіўленнем. А сёння амаль усе яны альбо ўжо пабудавалі загарадныя дамы, альбо дабудоўваюць. Мусіць, кожны з нас хто раней, хто пазней, але шукае сваю тэрыторыю для душы. Мне здаецца, што знайсці яе можна толькі побач з прыродай.

Так склалася, што ўзімку ідзе асноўная работа над празаічнымі творамі. І ведаеце, мне тут так утульна і спакойна, што нават не заўважаю, як бяжыць час. Тут цудоўна, бо, з аднаго боку, жывеш сярод прыроды, і ў той жа час ёсць усе звыклыя бытавыя выгоды. Горад высмоктвае сілу, а прырода яе дае. Калі выязджаю за кальцавую дарогу, вельмі добра гэта адчуваю.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота з архіва Наталлі Батраковай.**



Жыццялюбы

# «ЧАЦВЁРТУЮ ЧАСТКУ СВАЁЙ ПЕНСІІ АДДАЮ ВАВЁРКАМ»



**З Вячаславам Батурыным я пазнаёмілася ў сталічным Севастопальскім парку. Падцягнуты мужчына спяшаўся з пакецікам семак у бок маёй любімай алеі. «Гэта, відаць, вы тут вавёрачак падкормліваеце?» — пацікавілася. — «Я, — сціпла ўсміхнуўся ў адказ Вячаслаў Мікалаевіч. — У 71 год у любое надвор'е хаджу сюды штодзень, як на работу».**

Толькі паспеў мой новы знаёмы насыпаць семак у кармушку, як зверху навыперадкі спусціліся дзве вавёркі.

— Бачыце, як яны мяне тут чакаюць, ведаюць, што прынясу ім што-небудзь паласавацца. Вось трошкі прыхварэў. Тыдзень не хадзіў у парк. Дык увесь сперажываўся. Калі сюды не прыйду, мне чагосьці не хапае. Так, хлопцы (звяртаецца да галубоў, што прыляцелі следам), не нахабнічайце, дайце паесці сястрычкам.

Вячаслаў Мікалаевіч, пакуль не перакананецца, што вавёрачкі паелі, дзяжурыць побач з кармушкамі.

Раптам з дрэва куляй звалілася трэцяя вавёрка. Дзве яе сяброўкі так спужаліся, што, адскокнуўшы, сутыкнуліся ў паветры. Такое незвычайнае відовішча я бачыла ўпершыню.

— О, гэта Даша — самая жвавая з сямі вавёрак, што тут жывуць, — каментуе Вячаслаў Мікалаевіч. — Адразу бачна — гаспадыня, імгненна ўсіх разагнала.

Пакуль вавёркі ласаваліся семкамі, мужчына расказаў, што раней жыў у ваенным гарадку ва Уручы.

— А там жа лес кругом. Дык вось адна вавёрачка панадзілася прыходзіць на мой балкон. Я штодзень чакаў яе, адсмыслова пакідаў там семкі, арэшкі. А потым тая вавёрачка прапала. Я вельмі моцна перажываў. А пасля прачытаў, што іх век кароткі — усяго каля пяці гадоў.

Цяпер Вячаслаў Мікалаевіч жыве побач з Севастопальскім паркам. Яму як былому ваеннаму выдзелілі кватэру на вуліцы Лук'яновіча.

— Каб трымаць сябе ў форме, штодзень праходжу пехам як мінімум пяць кіламетраў. Найлепшае месца — гэта парк побач з домам. Там і прыкмеціў вавёрачак. Усе хочуць назірацьза імі, а карміць няма ахвотнікаў. Вось я і вырашыў узяць над севастопальскімі вавёрачкамі шэфства. Змайстраваў кармушкі і нашу ім ежу ды вадзічку. Пешчу вавёрачак, аддаю ім, можна сказаць, адну чацвёртую сваёй пенсіі. Дзякуй богу, магу дазволіць сабе гэта рабіць. У мяне як у ваеннага пенсія добрая. Купляю семкі, арэхі. Узімку, калі былі моцныя маразы, цэлую нізку сушаных грыбоў для іх набыў. Акрамя таго, збіраю жалуды, у мяне яшчэ цэлае вядро засталося з восені.

Пастаянныя наведвальнікі парка ўжо пазнаюць сябра вавёрак. Спыняюцца паразмаўляць, дзякуюць, што стварыў такое цудоўнае месца для назірання за пацешнымі жывёлкамі.

— Менавіта тут, на гэтай алеі, я і пазнаёміўся з аднадумцамі, Таццянай Іванаўнай ды яе мужам — Генадзь Андрэевіч таксама былы ваенны. Яны мне дапамагаюць падкормліваць вавёрак ды прыбірацца каля кармушак.



Акрамя вавёрак, на «алею Батурына» ўзімку прылятаюць карміцца гілі, сінічкі, зелянушкі, берасцяначкі, сойкі, шпакі, дзятлы... Для цікаўных пенсіянер павесіў побач з кармушкамі буклет з выявамі птушак і іх назвамі на беларускай і рускай мовах, які яму падарылі спецыялісты «Аховы птушак Бацькаўшчыны». А таксама міні-інструкцыю: чым можна карміць жыхароў парка, каб не нашкодзіць ім.

— Я заўважыў, што людзі праз няведанне кладуць у кармушкі кашу, якая зацвіла, хлеб. А хлебам, асабліва чорным, птушак карміць нельга. Найлепшы корм — несалёныя і нясмажаныя семкі сланечніка, несалёныя арахіс ды сала. Можна класці проса, але яны стамляюцца яго дзяўбці.

Да зімы Вячаслаў Мікалаевіч плануе змайстраваць яшчэ некалькі кармушак, каб усталяваць на іншых алеях. Ён вельмі спадзяецца, што наведвальнікі парка будуць ашчадна да іх ставіцца.

— Нейкія вандалы ў студзені зламалі ўсе кармушкі, — уздыхае мужчына. — Давялося аднаўляць. Людзі ж у парк прыходзяць розныя. Некаторыя цкуюць вавёрак сваімі сабакамі. Я прасіў іх гэтага не рабіць — трэба ж ратаваць жывёльны свет, які і так прападае. На жаль, не ўсе гэта разумеюць...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК. Фота аўтара.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

**Имущество ОАО «Молодечнолес»**

| № Лота | Наименование объекта, сведения о земельном участке (площадь, кадастровый номер) | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **<u>Недвижимое имущество:</u>** | | |
| 1 | **погреб пустоблочный** *(инв. № по бух. учету 11-091)*, общ. пл. 43,6 кв. м, инв. № 622/С-41031, **здание столовой** *(инв. № по бух. учету 11-090)*, общ. пл. 175,5 кв. м, инв. № 622/С-41030, **склад продовольственный** *(инв. № по бух. учету 11-092)*, общ. пл. 52,6 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000129 площадью 0,1728 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи до 1000 В *(0,0046 га)* | **930,96** | 93,00 |
| 2 | **здание конторы** *(инв. № по бух. учету 01-086)*, общ. пл. 167,9 кв. м, инв. № 622/С-41032, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000130 площадью 0,3271 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи до 1000 В *(0,0283 га)* | **113,03** | 11,00 |
| 3 | **здание мастерской** *(инв. № по бух. учету 05-529)*, общ. пл. 855,7 кв. м, **пожарный сарай** *(инв. № по бух. учету 01-098)*, общ. пл. 111,2 кв. м, **склад** *(инв. № по бух. учету 01-100)*, общ. пл. 147,6 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 625483402101000131 площадью 2,7827 га по адресу: Минская область, Столбцовский район, Налибокский с/с, д. Клетище. На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: охранная зона линии электропередачи до 1000 В *(0,0437 га)* | **2 205,13** | 220,00 |
| 4 | **здание столовой *(в состав входят: столовая, склад, погреб, навес, сарай)*** *(инв. № по бух. учету 11-034)*, общ. пл. 169,4 кв. м, **склад** *(инв. № по бух. учету 11-466),* общ. пл. 121,4 кв. м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 621350100007001973 площадью 0,4010 га по адресу: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, д. 106 | **3 719,73** | 371,00 |
| 5 | **здание конторы – диспетчерской (в состав входят: контора, сарай, уборная)** *(инв. № по бух. учету 01-012, 11-467)*, инв. № 631/С-13512, общ. пл. 120 кв. м, **здание мастерской и конторы,** инв. № 631/С-13513, *(инв. № по бух. учету 01-029)*, общ. пл. 615,7 кв. м, **здание заправки** *(инв. № по бух. учету 01-197),* общ. пл. 31,8 кв. м, **здание котельной** *(инв. № по бух. учету 01-198),* общ. пл. 145,4 кв. м, **склад** *(инв. № по бух. учету 01-196)*, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 621350100007001972 площадью 1,7384 га по адресу: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106.<br>Электротельфер с инв. № 5-893 | **23 812,45** | 1 190,62 |
| 6 | **здание РММ** *(инв. № по бух. учету 01-184)*, общ. пл. 972,1 кв. м, **здание конторы** (*инв. № по бух. учету 01-178*), общ. пл. 110 кв.м, **здание склада** (*инв. № по бух. учету 01-179*), общ. пл. 253,4 кв. м, **здание арочного сооружения** (*инв. № по бух. учету 05-574*), общ. пл. 136,8 кв. м, **здание столовой** (*инв. № по бух. учету 01-019*), общ. пл. 64,5 кв. м, **здание столовой** (*инв. № по бух. учету 11-153*), общ. пл. 135,3 кв.м, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 224050100002000633 площадью 1,3286 га по адресу: Витебская область, г. Поставы, ул. Вокзальная.<br>Набор мягкой мебели «Вивальди» с инв. № 09-377.<br>Набор мягкой мебели «Жасмин» с инв. 09-379.<br>Набор мягкой мебели «Оазис» с инв. 09-378.<br>Котел стационарный с инв. 04-095.<br>Трансформатор ТС-10Кв с инв. 04-096.<br>Шкаф КТП-25/10 с инв. 04-087 | **8 907,64** | 890,00 |
| | **<u>Транспортная техника:</u>** | | |
| 7 | **прицеп MAZ-900810-012** 2009 года выпуска, специальный роспуск, цвет – серый, регистрационный знак А 9826 А-5, кузов *(шасси, рама)* № Y3M90081090000036, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 136637 *(инв. № по бух. учету 08-613).* Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 | **296,27** | 29,63 |
| 8 | **прицеп MAZ 900810-012** 2009 года выпуска, специальный роспуск, цвет – серый, регистрационный знак А 9827 А-5, кузов *(шасси, рама)* № Y3M90081090000042, свидетельство о регистрации транспортного средства серии ОЕА № 136658 *(инв. № по бух. учету 06-614)*. Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 106 | **296,27** | 29,63 |
| 9 | **прицеп ГКБ 9362** 2000 года выпуска, роспуск, цвет – черный, регистрационный знак 4295 ОМ, кузов не зарегистрирован, свидетельство о регистрации транспортного средства серии РЕ № 005579 *(инв. № по бух. учету 08-466).* Транспорт находится по адресу: Минская область, г. Вилейка, 1 Мая, 106 | **275,11** | 27,51 |

**Оборудование, малоценные быстро снашивающиеся предметы:**

| № лота | Наименование объекта | Инвентарный номер согласно данным бухучета | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Сумма задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **10** | Компьютер (ПЭВМ, монитор ЖК) | 07-215 | **5,96** | 0,60 |
| **11** | Компьютер (ПЭВМ, монитор ЖК) | 07-213 | **5,55** | 0,60 |
| **12** | Компьютер SAMSUNG | 07-082 | **12,33** | 1,23 |
| **13** | Компьютер «Селерон» | 07-061 | **3,70** | 0,40 |
| **14** | Принтер Canon MF44101зав.№79183 | 07-218 | **10,28** | 1,03 |
| **15** | ПЭВМ «Сильверадо» | 07-211 | **7,40** | 0,74 |
| **16** | ПЭВМ «Сильверадо» LG | 07-210 | **7,40** | 0,74 |
| **17** | Факс «Панасоник» | 09-314 | **6,99** | 0,70 |
| **18** | Факс «Панасоник» | 09-315 | **6,99** | 0,70 |
| **19** | Факс «Панасоник» | 09-156 | **3,70** | 0,40 |
| **20** | Набор «Премьер-1» | 09-152 | **8,84** | 0,90 |
| **21** | Установка для напайки | 05-695 | **166,46** | 16,65 |
| **22** | Мебель (столы, стулья, шкафы), в том числе: стол кабинетный, стул (3 шт.), шкаф для одежды (2 шт.), шкаф для одежды (12 шт.), печь СВЧ б/у, печь СВЧ б/у, стенд, тележка гидравлическая | --- | **65,76** | 6,58 |
| **23** | Оргтехника, в том числе: многофункциональное устройство HP Laser Jet Pro M, телефакс Panasonic 982 | --- | **14,18** | 1,42 |
| **24** | Спецодежда, в том числе: брюки DYNAMIC (1 шт.), каска защитная (10 шт.), костюм (куртка, брюки) (11 шт.), куртка STANDART (1 шт.), сапоги резиновые ECONOMY (1 шт.) | --- | **55,49** | 5,55 |

**Стоимость снижена на 90 %.**

В соответствии с абзацем 4 п.1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Условия аукциона по лотам № 5 и № 6: победитель (единственный участник) аукциона обязан заключить с должником договор ответственного хранения имущества ОАО «Молодечнолес» на безвозмездной основе.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

**<u>Победитель аукциона (единственный участник аукциона)</u> в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона:**

**по лотам №№ 1—4, 7—24 <u>возмещает затраты на организацию и проведение результативного аукциона;</u>**

**по лоту № 5 <u>оплачивает вознаграждение, включающее затраты на проведение аукциона,</u> за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукцион;**

**по лоту № 6 <u>оплачивает вознаграждение, включающее затраты на проведение аукциона,</u> в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, — доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

